Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная Партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і Мінскага Абкома КП(б)Б

233 (6812) | 6 кастрычніка 1940 г., нядзеля | ЦАНА 10 КАП.

СІСТЭМАТЫЧНА ПРАВЯРАЦЬ ВЫКАНАННЕ ПАРТЫЙНЫХ РАШЭННЯЎ!

Кантроль і праверка выканання ў рах большэвікоў — магутная, дзейсная зброя. Арганізацыйнай рабоце наша партыя заўсёды надавала выключнае значэнне. А кантроль, падбор людзей і праверка выканання — галоўнае ў арганізацыйнай рабоце.

«Правяраць людзей і правяраць фактычнае выкананне справы — у гэтым, пачэ раз у гэтым, толькі ў гэтым зараз вось усёй работы, усёй палітыкі». Гэта вучае ўказанне Уладзіміра Ільіча Леніна не страціла і ніколі не страціць свайго значэння, бо яно ляжыць у аснове большэвіцкага кіраўніцтва, сталінскага стылю работы.

Таварыш Сталін вучыць, што «добра арганізаваная праверка выканання — гэта той пражэктар, які дапамагае асвятляць становішча работы апарата ў любы час і выводзіць на свет божы бюракратаў і абыякавым.

Можна з упэўненасцю сказаць, што дзевяць дзесятых нашых бедрох і прарываў аб'ясняецца адсутнасцю правільна пастаўленай праверкі выканання...» XVIII з'езд партыі, вызначыўшы генеральную лінію нашай партыі на цэлую гістарычную паласу, таксама паставіў задачу ўзмацнення кантролю і праверкі выканання рашэнняў партыі.

У асяроддзі нашых кіруючых работнікаў, асабліва партыйнага апарата, часта можна пачуць выражэнне «давярай і правярай», але на справе мы нярэдка сустракаемся з фактамі забыцця гэтага большэвіцкага правіла. На жаль, яшчэ нямала ёсць партыйных работнікаў, якія слепа вераць у сілу пастановы, забываючы, што самае важнае пасля прыняцця правільнага рашэння — гэта правесці яго ў жыццё і праверыць яго выкананне.

ЦК КП(б)Б праверыў, як Віцебскі абком партыі выконвае пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб развіцці грамадскай жывёлагадоўлі ў калгасах». ЦК устанавіў, што ў Віцебскай абласці гэтае важнейшае рашэнне выконваецца нездавальняюча, не глядзячы на тое, што Цэнтральны Камітэт партыі не раз указваў Віцебскаму абкому і выканкому абласнога савета на нездавальняючае становішча грамадскай жывёлагадоўлі ў калгасах, на непрыпімую бесклапотнасць і самацёк у кіраўніцтве гэтай справай. Аднак абком партыі і выканком абласнога савета не прынялі мер да выпраўлення недахопаў, больш таго, яны ўпорна не заўважалі буйнейшых прарываў у галіне развіцця жывёлагадоўлі.

Перад намі не толькі яркі прыклад зусім нездавальняючай работы па выкананню важнейшага рашэння партыі і ўрада, але і прыклад забыцця сталінскіх указанняў аб кантролі і праверцы выканання. Віцебскі-ж абком партыі не раз абмяркоўваў пытанні развіцця жывёлагадоўлі ў абласці, асобных раёнах, прымаў нямала рашэнняў, але бяда ў тым, што гэтыя рашэнні тут-жа забываліся.

Выключна дрэнна абстаіць справа з праверкай выканання партыйных рашэнняў у Барысаўскім гаркоме КП(б)Б. Гэта асабліва яркі праявілася ў стылі кіраўніцтва гаркома прамысловасцю, партарганізацыямі прадпрыемстваў. Яшчэ ў чэрвені месяцы 1940 года гарком заслухаў даклад сакратара партарганізацыі завода імені Молатава тав. Левіна па пытанню аб кантролі дзейнасці адміністрацыі. Было прынята «разгорнутае рашэнне». Калі-б гарком сур'ёзна адносіўся да сваіх уласных рашэнняў, ён паклапаціўся-б аб правядзенні іх у жыццё, але такіх клопатаў у гаркоме няма. Рашэнне гэтае не было нават паслана пярвічнай партарганізацыі. Такі-ж лёс пасціг і некаторыя іншыя рашэнні, прынятыя гэтым гаркомам, у прыватнасці па пытаннях абаронна-масавай работы.

Ёсць нямала і іншых фактаў, якія сведчаць аб тым, што асобныя партыйныя кіраўнікі забыліся аб выключным значэнні, якое надае ЦК ВКП(б) справе праверкі выканання партыйных рашэнняў. Між тым жыццё паказвае і пераконвае, што адсутнасць сістэматычнай, штодзённай праверкі і кантролю прыводзіць да бездзейнасці, самацёка, да падмены сапраўднай большэвіцкай работы пустой мітусней, канцылярыстчынай.

Істотным недахопам пастаноўкі праверкі выканання ва многіх партыйных органах з'яўляецца тое, што кантроль своечасова не папярэджвае зрываў і памылак.

Іменна так абстаяла, напрыклад, справа з выпраўленнем памылак, дапушчаных Церахоўскім райкомам КП(б)Б. Гэты райком на працягу двух месяцаў пасля прыняцця ЦК ВКП(б) пастановы аб выпраўленні недахопаў у справе прыёму новых членаў і кандыдатаў партыі не толькі не выпраўляў сваіх памылак, а паглыбляў іх. Гомельскі-ж абком партыі прыняў меры з вялікім спазненнем, пасля таго, як гэтыя памылкі былі зроблены, а іх можна і трэба было папярэдзіць. Неабходна пакончыць з гэтымі недахопамі ў пастаноўцы кантролю і праводзіць праверку выканання сістэматычна, глыбока і абавязкова канкрэтна.

У радзе партыйных арганізацый кантроль выканання партыйных рашэнняў праводзіцца кампанейска. Раптам наступае абследвацельскі зуд. Для праверкі таго ці іншага пытання ствараюцца дзесяткі камісій. Камісіі абследуюць, правяраюць, потым засядаюць. А ў выніку... так званыя вывады нярэдка прышываюцца да справы. Такая кампанейшчына — хутчэй сведчанне адсутнасці праверкі выканання.

Велізарнае значэнне ў пастаноўцы кантролю выканання партыйных рашэнняў мае афармленне партыйных дакументаў і іх праверка. Прымаючы рашэнне па таму ці іншаму пытанню, трэба імкнуцца да найбольшай канкрэтнасці, каб было відаць, што, каму і як трэба выконваць.

Кантроль выканання рашэнняў слаба пастаўлен і ва многіх пярвічных партыйных арганізацыях. Неабходна, нарэшце, увесці ў сістэму, каб на кожным партыйным сходзе заслухоўвалася інфармацыя сакратара, або члена партыйнага бюро аб выкананні раней прынятых агульным партыйным сходам рашэнняў. Гэта асабліва патрэбна зараз, калі наша партыя і ўся совецкая грамадскасць вядзе барацьбу за высокую дысцыпліну працы, павышэнне прадукцыйнасці працы, за большэвіцкі парадак на прадпрыемствах і ва ўстановах.

Партыя Леніна — Сталіна з'яўляецца адзінай у свеце партыяй рэволюцыйнага дзеяння. Адзінства тэорыі і практыкі, адзінства слова і справы — незадмная рыса большэвіцкага кіраўніцтва, сталінскага стылю работы. Партыя правярае кожнага свайго работніка па яго канкрэтных справах, па яго ўменню быстра, аператыўна і па-дзелавому правесці ў жыццё рашэнні партыі і ўрада. Праверка выканання — важнейшы сродак паляпшання ўсёй работы, нашага няўхільнага і быстрага руху ўперад на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва.

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР

АБ ДАПАЎНЕННІ ЗАКОНА АБ УСЕАГУЛЬНЫМ ВОІНСКІМ АБАВЯЗКУ

Дапоўніць закон аб усеагульным воінскім абавязку, прыняты Вярхоўным Советам СССР 1 верасня 1939 года, артыкуламі наступнага зместу:

1. Грамадзяне, прызваныя на сапраўдную ваенную службу, абавязаны з'яўляцца ў воінскія часці ва ўласнай сапраўднай вопратцы, маючы пры сабе: пару нацельнай бялізны, адну верхнюю кашулю або верхнюю куртку, адны штаны, сапраўны абутак (боты або бацінкі), цёплае паліто або ватную куртку, галаўны ўбор і мяшок для ўкладкі ўласных рэчаў.

Пасля прыбыцця ў воінскую часць, залічаным на сапраўдную ваенную службу выдаецца казённае ваеннае абмундзіраванне па ўстаноўленых нормах, а ўласныя рэчы прызыўнікоў прымаюцца воінскімі часцямі на хаванне ў вайсковых складах на ўвесь час знаходжання яго на сапраўднай ваеннай службе.

2. Пры звальненні ў запас з воінскіх часцей радавога і малодшага начальствуючага састава ваеннае абмундзіраванне, якое знаходзіцца ў іх на руках, поўнасцю здаецца ў вайсковыя склады, а ім зварачаецца іх уласная вопратка.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль. 4 кастрычніка 1940 г.

Святкаванне юбілея 30-гадовай літаратурнай дзейнасці Змітрака Бядулі

Учора, у памяшканні Першага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драматычнага тэатра адбылося ўрачыстае пасяджэнне Праўлення саюза совецкіх пісьменнікаў БССР сумесна з прадстаўнікамі партыйных і грамадскіх арганізацый Мінска, прысвечанае 30-годдзю літаратурнай дзейнасці старэйшага беларускага пісьменніка ордэнаносца Змітрака Бядулі.

Пасяджэнне кароткай уступнай прамовай адкрыў старшыня ўрадавай камісіі па правядзенню юбілея, прэзідэнт Акадэміі навук БССР т. Горэў.

Даклад аб 30-годдзі літаратурнай дзейнасці Змітрака Бядулі зрабіў т. Вольскі. Ён ахарактарызаваў творчы шлях таленавітага беларускага пісьменніка, аўтара многіх выдатных кніг.

Пісьменніка віталі ад імені праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР тав. Лынькоў, ад калектыва Першага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага сцяга драматычнага тэатра народны артыст БССР Владамірскі і ад настаўнікаў школ горада Мінска — т. Рунько.

На пасяджэнні былі агалошаны прывітальныя тэлеграмы, атрыманыя ад многіх арганізацый.

У заключэнне з шчырай, усхваляванай прамовай выступіў юбіляр. Ён выказаў вялікую ўдзячнасць партыі і ўраду за высокую ацэнку яго літаратурнай работы і абавязаўся і надалей плённа працаваць на карысць вялікага совецкага народа.

Пасля ўрачыстага пасяджэння прысутныя глядзелі спектакль «Салавей» у пастаноўцы І Дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага сцяга драматычнага тэатра БССР.

XIV З'ЕЗД ЛКСМБ

Група дэлегатаў XIV з'езда комсамола Беларусі ад Мінскай вобласці (злева направа): З. П. Бараноўская — трактарыстка-камбайнерка, Слуцкага раёна, Кучынскай МТС; Ф. Г. Грыб — камбайнерка Дзяржынскага раёна, Пучынскай МТС; А. М. Нячосаў — нам. палітрука Н-скай часці, узнагароджаны ордэнам «Красное Знамя»; М. П. Одэрзух—абцяжчык абутковай фабрыкі імені Кагановіча, узнагароджаны медаллю «За трудовое отличие»; С. К. Іофе — былы сакратар Плешчаніцкага райкома комсамола, узнагароджаны ордэнам «Красная Звезда»; А. І. Беразоўскі — сакратар райкома комсамола Любаньскага раёна; Ф. А. Бакунчык — сакратар Пухавіцкага райкома комсамола.

Фото І. Казловіча.

РАНІШНЯЕ ПАСЯДЖЭННЕ З'ЕЗДА 5 КАСТРЫЧНІКА

Учора, у 12 гадзін дня, у вялікім зале Дома партыйных курсаў, адкрыўся XIV з'езд ленінска-сталінскага комсамола Беларусі. Цвет беларускай моладзі, сотні юнакоў і дзяўчат, якія прадстаўляюць 260.000-ю армію комсамола Беларусі, сабраліся, каб падвесці вынікі работы, праведзенай за перыяд, прайшоўшы пасля XIII з'езда ЛКСМБ, намеціць чарговыя задачы. Сярод дэлегатаў — знатныя людзі рэспублікі: стаханаўцы прамысловасці і транспарта, камбайнеры, трактарысты, ільнаводы, майстры высокіх ураджаяў, прадстаўнікі інтэлігенцыі і Чырвонай Арміі. Многія з іх за самаадданую работу і баявыя заслугі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі Совецкага Саюза.

У прэзідыум з'езда выбіраюцца першы сакратар ЦК КП(б)Б тав. **Панамарэнка**, старшыня СНК БССР тав. **Былінскі**, старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР тав. **Наталевіч**, сакратары ЦК КП(б)Б тт. **Кулагін** і **Малін**, Нарком унутраных спраў БССР тав. **Цанава**, сакратар Мінскага абкома і гаркома КП(б)Б тав. **Матвееў**, камандуючы Заходняй Асобай Ваеннай Акругай Герой Совецкага Саюза, генерал-палкоўнік тав. **Паўлаў**, загадчык оргінструктарскім аддзелам ЦК КП(б)Б тав. **Эйдзінаў**, сакратар ЦК ВЛКСМ тав. **Насевкін**, сакратары ЦК ЛКСМБ тт. **Каралёў, Ефройкін, Чэрнікава, Крыўчонак**, Герой Совецкага Саюза тав. **Куніжэў**, знатны камбайнер Жлобінскай МТС, узнагароджаны ордэнам Леніна, тав. **Гараўцоў**, стаханаўка віцебскай чулочна-трыкатажнай фабрыкі «КІМ», узнагароджаная ордэнам Леніна, тав. **Падскочава** і іншыя — усяго 37 чалавек.

Бурнымі апладысментамі сустрэлі дэлегаты з'езда прапанову аб выбранні пачотнага прэзідыума. Пры ўпамінанні імені таварыша Сталіна, дэлегаты наладжваюць у чэсць правадыра народаў працяглую авацыю. У пачотны прэзідыум выбіраецца Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з таварышам Сталіным. Гром апладысментаў узнікае з новай сілай, калі ўносіцца прапанова выбраць пачотным старшынёй з'езда таварыша Сталіна. Доўга не змаўкаюць апладысменты. Раздаюцца прывітальныя воклічы «Нахай жыве таварыш Сталін!», грыміць магутнае «ура!».

Пасля выбараў кіруючых органаў з'езда — мандатнай камісіі, сакратарыята і рэдакцыйнай камісіі — слова для справаздачнага даклада прадастаўляецца сакратару Цэнтральнага Камітэта ЛКСМБ тав. Каралёву.

— За справаздачны перыяд, — гаворыць тав. Каралёў, — ленінска-сталінскі комсамол Беларусі пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі стаў больш актыўна ўдзельнічаць у дзяржаўным жыцці, лепш і больш займацца гаспадарчымі пытаннямі. Пасля гістарычных рашэнняў XVIII з'езда ВКП(б) дзейнасць комсамола стала больш багатай, шматграннай і мэтанакіраванай.

Тав. Каралёў падрабязна спыніўся на поспехах, дасягнутых комсамолам рэспублікі пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі, за перыяд з XIII па XIV з'езд ЛКСМБ. 66 комсамольцаў—ініцыятараў стаханаўскага руху на вытворчасці і ў сельскай гаспадарцы ўзнагароджаны ў 1939—40 гг. ордэнамі і медалямі Саюза ССР. Дакладчык расказвае аб выдатных узорах работы ордэнаносцаў тт. Падскочавай, Шыманскага, Краснабаева, Гараўцова, Бяляева і іншых.

У прамысловасці, на транспарце, у сельскай гаспадарцы — усюды комсамол з'яўляецца застрэльшчыкам, ініцыятарам стаханаўскіх метадаў работы. Толькі па 26 прадпрыемствах рэспублікі за перыяд пасля XVIII з'езда ВКП(б) комсамольцы унеслі 688 рацыяналізатарскіх прапаноў, якія далі да 2 млн. рублёў эканоміі. У вёсцы па ініцыятыве комсамольскіх арганізацый у мінулым годзе было створана 3.000 комсамольска-маладзёжных звенняў высокага ўраджаю, у гэтым годзе—4.000.

Аднак, у галіне ўдзелу ў вытворчай рабоце комсамол Беларусі мае цэлы рад істотных недахопаў. Комсамольскія арганізацыі і іх кіруючыя органы, пачынаючы ад пярвічных і канчаючы Цэнтральным Камітэтам ЛКСМБ, слаба ўзначалілі барацьбу за большэвіцкае ажыццяўленне Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня і 10 ліпеня. На многіх прадпрыемствах і ва ўстановах комсамольцы не служаць прыкладам моцнай дзяржаўнай дысцыпліны. У адной толькі Віцебскай вобласці зрабілі прагулы 496 комсамольцаў. Асобныя камітэты пярвічных арганізацый, райкомы і гаркомы ЛКСМБ праяўляюць гнілы лібералізм да дэзарганізатараў вытворчасці, зрыўшчыкаў працоўнай дысцыпліны.

Па бабруйскім заводзе № 4 тры комсамольцы—Ахрэмчук, Курыльчык, Кетчык—зрабілі прагулы. Камітэт комсамола (сакратар тав. Васільева), разбіраючы справы аб прагулах, вынес смехатворнае рашэнне: «папярэдзіць, каб больш прагулы не рабілі».

ЦК ВЛКСМ зусім правільна ўказаў на дрэннае кіраўніцтва ЦК ЛКСМБ кантролем за ажыццяўленнем Указа ад 26 чэрвеня. Але ў дакладзе тав. Каралёва не было самакрытыкі. Ён не ўскрыў сапраўдных прычын дрэннай работы комсамольскіх арганізацый па ўмацаванню працоўнай дысцыпліны.

Вялікае месца ў дакладзе было адведзена пытанням арганізацыйнага ўмацавання комсамола Беларусі. За справаздачны перыяд — менш чым за два гады — па рэспубліцы прынята ў комсамол 130.963 чалавекі, з іх 51.582—дзяўчаты. У комсамол у асноўным прымаюцца перадавыя, праверэныя на практычнай рабоце юнакі і дзяўчаты. Але ёсць яшчэ комсамольскія арганізацыі, якія ў пагоні за колькасным ростам прымаюць у комсамол усіх, падаўшых заявы. У паравозным дэпо ст. Мінск быў прынят у комсамол пехта Андрыеўскі, які меў 13 прыводаў у міліцыю і асуджан зараз за пакражу.

XI пленум ЦК ВЛКСМ намеціў канкрэтныя мерапрыемствы па перабудове комсамольскай работы. Да пленума кіруючыя работнікі райкомаў і гаркомаў, не ўзначальваючы актыўнасці комсамольцаў, прабавалі ўсю работу весці сіламі платных работнікаў. Зараз у райкомах, гаркомах і палітаддзелах чыгунак рэспублікі створаны 932 пастаянныя камісіі, у рабоце якіх удзельнічаюць 7.469 комсамольцаў. Комсамольская работа ў сувязі з гэтым значна ажывілася.

Аднак трэба адзначыць, што многія комсамольскія кіраўнікі не ўзначалілі перабудову работы ў адпаведнасці з патрабаваннямі XI пленума ЦК ВЛКСМ. У многіх райкомах і гаркомах усё яшчэ не давяраюць маладым комсамольцам, абмяжоўваюцца толькі старым непматлікім актывам. У Кармянскім і многіх іншых раёнах пастаянныя камісіі яшчэ не створаны. У Антопальскім РК ЛКСМБ у камісію па агітацыі і прапагандзе «падабралі» загадчыка райаддзелам аховы здароўя, загадчыка аддзелам прапаганды і агітацыі РК КП(б)Б, нарсудзю, дырэктара камбіната, памочніка сакратара райкома КП(б)Б. Прыкладна такое-ж становішча ў Высокаўскім, Круглянскім, Сіроцінскім, Жабчыцкім і іншых раёнах. У многіх райкомах да перабудовы падыйшлі фармальна. Многія комсамольскія кіраўнікі лічаць, што на стварэнні камісій канчаецца ўся перабудова.

ЦК ВЛКСМ указаў на дрэнную работу ЦК ЛКСМБ па ўмацаванню комсамольскай дысцыпліны. 55.000 комсамольцаў у БССР маюць запазычанасць па членскіх узносах ад месяца і больш. Дакладчык несамакрытычна, мімаходам спыніўся на гэтым факце. ЦК ЛКСМБ дрэнна ўзначаліў барацьбу за ўмацаванне комсамольскай дысцыпліны, ліберальна аднёсся да асобных комсамольскіх кіраўнікоў, якія не выконваюць рашэнняў ЦК ВЛКСМ і статута комсамола. ЦК ЛКСМБ не арганізаваў большэвіцкую праверку выканання рашэнняў ЦК ВЛКСМ і сваіх уласных пастаноў. Многія нядрэнныя рашэнні ЦК ЛКСМБ асталіся толькі на паперы.

Многа гаварыў дакладчык аб рабоце комсамола ў школе. Вынікі мінулага навучальнага года гавораць, што комсамол Беларусі недастаткова займаецца школамі, мала яшчэ зрабіў, каб павысіць паспяховасць і палепшыць дысцыпліну вучняў. Школы рэспублікі адстаюць ад прад'яўляемых ім патрабаванняў.

63 тысячы комсамольцаў самастойна вывучаюць «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», але кантроль над самаадукацыяй комсамольцаў у многіх месцах пастаўлен выключна дрэнна. Недастаткова яшчэ працуюць над павышэннем свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню кіруючыя кадры комсамола. Сакратар Будакашалёўскага райкома ЛКСМБ тав. Мажэйка, сакратар Жабчыцкага райкома тав. Фалінская і іншыя зусім не вучацца. Комсамольскія арганізацыі мала ўвагі ўдзяляюць антырэлігійнай прапагандзе.

Асобна дакладчык спыніўся на рабоце комсамольскіх арганізацый заходніх абласцей БССР. Яны прарабілі вялікую работу. Аднак, яны дапускаюць яшчэ і многа памылак, у асаблівасці ў справе прыёму новых членаў і кандыдатаў ВЛКСМ. На жаль, ЦК ЛКСМБ не заўсёды своечасова выпраўляе гэтыя памылкі.

У дакладзе вельмі мала месца было адведзена рабоце калгасных комсамольскіх арганізацый. Недастаткова востра тав. Каралёў асвятліў і пытанні ваенна-фізкультурнай работы.

Пасля даклада тав. Каралёва ранішняе пасяджэнне закончылася.

ВЯЧЭРНЯЕ ПАСЯДЖЭННЕ З'ЕЗДА 5 КАСТРЫЧНІКА

Вячэрняе пасяджэнне XIV з'езда ЛКСМБ пачалося справаздачным дакладам рэвізійнай камісіі. Дакладчык тав. **Сенько** гаворыць аб узросшай актыўнасці беларускай комсамольскай арганізацыі, аб яе згуртаванасці вакол комуністычнай партыі, вакол правадыра партыі і народаў таварыша Сталіна.

Дакладчык падрабязна спыняецца на стане фінансавай дысцыпліны ў пярвічных арганізацыях, райкомах, абкомах і ЦК ЛКСМБ.

Затым тав. Сенько гаворыць аб стане ўчоту і рэагавання на паступаючыя ў ЦК ЛКСМБ пісьмы і скаргі комсамольцаў. Ён адзначае, што не заўсёды ЦК і мясцовыя комсамольскія органы чула адносяцца да пісем комсамольцаў.

Калі здавальняюча пастаўлен учот і хаванне комсамольскіх дакументаў, то справаздачнасць аб скарыстанні іх прадстаўляецца нясвоечасова. Многія мясцовыя комсамольскія органы нарушаюць устаноўлены ЦК ВЛКСМ тэрмін выдачы комсамольскіх дакументаў новапрынятым комсамольцам. Дакладчык далей указвае, што ў ЦК ЛКСМБ нездавальняюча пастаўлена праверка выканання як сваіх уласных рашэнняў, так і рашэнняў ЦК ВЛКСМ.

Па справаздачных дакладах ЦК ЛКСМБ і рэвізійнай камісіі разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі. Першай выступае сакратар Пінскага абкома комсамола тав. **Сысоева**. Яна гаворыць аб тых велізарных зменах, якія адбыліся за год совецкай улады ў Пінскай вобласці. У вобласці створана 295 пярвічных комсамольскіх арганізацый. У комсамол уступае дешная, перадавая моладзь. Комсамольскія арганізацыі з першых крокаў сваёй дзейнасці прымаюць актыўны ўдзел у дзяржаўнай і гаспадарчай рабоце. Комсамольска-маладзёжныя брыгады на будаўніцтве Днепра-Бугскага канала паказалі ўзоры сапраўды большэвіцкіх адносін да працы, з'явіліся ініцыятарамі соцыялістычнага спаборніцтва на будоўлі.

Звеннявая калгаса імені Сталіна, Ганцэвіцкага раёна, тав. **Берташ** расказвае, з якой актыўнасцю ўдзельнічае ў будаўніцтве новага жыцця сельская моладзь.

— Наша комсамольская арганізацыя,— гаворыць тав. Берташ, — налічвае 15 чалавек. Маладыя комсамольцы актыўна ўключыліся ў работу калгаса, умацоўваюць працоўную дысцыпліну. Сваім асабістым прыкладам комсамольцы натхняюць на стахановскую работу ўсіх калгаснікаў. Радасныя вынікі першага года калектыўнай працы. Былыя батракі і беднякі на свае працадні атрымліваюць столькі збожжа і бульбы, што ніколі аб гэтым раней нават не марылі.

— Беларуская комсамольская арганізацыя, — гаворыць сакратар Уэдзенскага РК ЛКСМБ тав. Осмалоўскі, — як ніколі, згуртавана вакол партыі Леніна — Сталіна, вакол любімага правадыра і друга совецкай моладзі таварыша Сталіна. Партыйнае кіраўніцтва было, ёсць і будзе крыніцай сілы і магутнасці комсамола.

Як дастойныя памочнікі большэвіцкай партыі, комсамольцы нашага раёна прымаюць актыўны ўдзел ва ўсёй дзяржаўнай і гаспадарчай дзейнасці. Па пачыну комсамольцаў у калгасах разгарнуўся рух за высокі ўраджай. Комсамольцы арганізавалі загатоўку і вывазку торфу, збор іншых мясцовых угнаенняў, актыўны ўдзел прынялі ў асушцы балот і будаўніцтве вадаёмаў.

Тав. Осмалоўскі крытыкуе аддзел сялянскай моладзі ЦК ЛКСМБ за нездавальняючае кіраўніцтва работай па падрыхтоўцы дзяўчат-трактарыстак без адрыву ад вытворчасці. Ён таксама ўказвае, што газеты «Чырвоная змена» і «Сталинская молодежь» дрэнна асвятляюць комсамольскае жыццё.

Стану прапагандысцкай і агітацыйна-масавай работы ў комсамоле прысвячае сваё выступленне сакратар Палескага абкома комсамола тав. **Прыхожан**. Яна гаворыць, што комсамольскія арганізацыі пясуць адказнасць перад партыяй за комуністычнае выхаванне моладзі. 12.000 комсамольцаў і несаюзнай моладзі вобласці сістэматычна працуюць пад павышэннем свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню, вывучаюць «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)». Аднак, пастаноўка прапаганды марксізма-ленінізма ў комсамоле пакідае жадаць шмат лепшага.

Тав. Прыхожан гаворыць, што ЦК ЛКСМБ, а па яго прыкладу і мясцовыя комсамольскія арганізацыі, нездавальняюча яшчэ арганізавалі выхаванне комсамольскага актыва, не клапоцяцца аб палітычнай вучобе комсамольцаў, непадрыхтаваных да самастойнага вывучэння гісторыі партыі. У комсамоле яшчэ не створана грамадская думка супроць тых, хто сістэматычна не працуе над павышэннем свайго палітычнага і культурнага ўзроўню.

Памочнік начальніка Палітаддзела па комсамолу Беластоцкай чыгункі тав. **Міхайлін** расказаў аб вялікай рабоце, праробленай комсамольцамі-чыгуначнікамі па аднаўленню і забеспячэнню бесперабойнай работы транспарта. Ён падрабязна спыніўся на тым, які ўдзел прымаюць комсамольцы-чыгуначнікі ў выкананні Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня. Тав. Міхайлін указвае, што Цэнтральны Камітэт ЛКСМБ зусім нездавальняюча кіруе работай транспартных комсамольскіх арганізацый.

Аб недахопах работы комсамольскіх арганізацый прадпрыемстваў Мінска гаворыць у сваім выступленні сакратар Мінскага абкома ЛКСМБ тав. **Мальчэўскі**. Ён адзначае, што комсамольскія арганізацыі станкабудаўнічага завода імені Кірава, швейнай фабрыкі «Кастрычнік» і інш. слаба змагаюцца за рэалізацыю Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня і 10 ліпеня. Сярод нарушальнікаў працоўнай дысцыпліны і бракаробаў на гэтых прадпрыемствах ёсць комсамольцы. На фабрыцы «Кастрычнік» многія комсамольцы не выконваюць норм, робяць брак. Комсамольскі камітэт праходзіць міма гэтых з'яў, не рэагуе на іх.

Тав. Мальчэўскі спыняецца на фактах грубага нарушэння некаторымі комсамольцамі статута ВЛКСМ. Комсамольскія арганізацыі часта не прыцягваюць да адказнасці нарушальнікаў саюзнай дысцыпліны.

Сакратар Свянцянскага РК ЛКСМБ тав. **Афанасьеў** зварачае ўвагу на неабходнасць паляпшэння работы школ, асабліва польскіх і літоўскіх. Ён указвае, што Наркомасветы БССР не прыняў мер да своечасовага забеспячэння гэтых школ неабходнымі падручнікамі і наглядными дапаможнікамі.

У спрэчках таксама выступілі тт. **Галенчык** (г. Ліда), **Маўрын** (Беласток), **Каробка** (П-ская часць), **Глушанкова** (Орша), **Барстон** (Чашнікі).

На гэтым вячэрняе пасяджэнне XIV з'езда ЛКСМБ закрылася. Сёння з'езд прадаўжае сваю работу.

Зацверджан СНК СССР 4 кастрычніка 1940 г.

ЗАГАД №1

Галоўнага Ўпраўлення Працоўных Рэзерваў пры СНК СССР

г. Масква, 4 кастрычніка 1940 г.

Аб падрыхтоўцы к пачатку вучэбнага года і аб прыёме гарадской і калгаснай моладзі ў Рамесленыя Вучылішчы, Чыгуначныя Вучылішчы і ў школы Фабрычна-Заводскага Абучэння

У выкананне Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета Саюза ССР ад 2 кастрычніка 1940 года «Аб Дзяржаўных Працоўных Рэзервах СССР» і пастановы Соўнаркома Саюза ССР ад 2 кастрычніка 1940 года «Аб прызыве гарадской і калгаснай моладзі ў Рамесленыя Вучылішчы, Чыгуначныя Вучылішчы і школы Фабрычна-Заводскага Абучэння» загадваю:

1. У Рамесленыя Вучылішчы і ў Чыгуначныя Вучылішчы прымаць гарадскую і калгасную моладзь мужчынскага полу ва ўзросце 14—15 год. з адукацыяй не менш чым у аб'ёме пачатковай школы або чатырох класаў сярэдняй школы.

2. У школы Фабрычна-Заводскага Абучэння прымаць гарадскую і калгасную моладзь мужчынскага полу ва ўзросце 16—17 год незалежна ад агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі.

3. Навучаючыяся як мужчынскага, так і жаночага полу школ Фабрычна-Заводскага Вучнёўства, рэарганізуемых у Рамесленыя і Чыгуначныя Вучылішчы і ў школы Фабрычна-Заводскага Абучэння, карыстаюцца пераважным правам прыёму ў Рамесленыя Вучылішчы, Чыгуначныя Вучылішчы і ў школы Фабрычна-Заводскага Абучэння.

4. Пры прыёме ў Чыгуначныя Вучылішчы перавагу прадастаўляць дзецям работнікаў чыгуначнага транспарта.

5. Дазволіць дырэктарам Рамесленых Вучылішчаў, Чыгуначных Вучылішчаў і школ Фабрычна-Заводскага Абучэння прымаць з школ фабрычна-заводскага вучнёўства, рэарганізуемых у Рамесленыя Вучылішчы, Чыгуначныя Вучылішчы і ў школы Фабрычна-Заводскага Абучэння, у выглядзе выключэння, тых навучаючыхся, як мужчынскага, так і жаночага полу, якія маюць узрост вышэй устаноўленага для прыёму ў Рамесленыя і Чыгуначныя Вучылішчы і ў школы ФЗА.

6. Выходзячы з таго, што ў Рамесленых Вучылішчах і Чыгуначных Вучылішчах падрыхтоўваюцца рабочыя складаных прафесій, увесці ў Рамесленых Вучылішчах і ў Чыгуначных Вучылішчах, апрача вытворчага абучэння, выкладанне агульнаадукацыйных і спецыяльных дысцыплін, звязаных з абучэннем данай прафесіі.

7. Устанавіць пачатак вучэбнага года ў Рамесленых Вучылішчах, Чыгуначных Вучылішчах і ў школах Фабрычна-Заводскага Абучэння — з 1 верасня. Як выключэнне, у 1940 годзе вучэбны год пачаць у Рамесленых Вучылішчах, Чыгуначных Вучылішчах і ў школах Фабрычна-Заводскага Абучэння з 1 снежня.

8. Працягласць вучэбнага дня ў Рамесленых і Чыгуначных Вучылішчах вызначыць у 7 гадзін, зыходзячы з разліку — 5 гадзін на вытворчае абучэнне і 2 гадзіны на агульнаадукацыйныя і спецыяльныя дысцыпліны.

9. Працягласць вучэбнага дня ў школах Фабрычна-Заводскага Абучэння вызначыць у 8 гадзін.

10. Абучэнне ў Рамесленых Вучылішчах і ў Чыгуначных Вучылішчах — бясплатнае. Навучаючыяся ў перыяд абучэння забяспечваюцца за кошт дзяржавы падручнікамі, вучэбнымі дапаможнікамі, харчаваннем, вопраткай, спецвопраткай, бялізнай, абуткам, а прыбыўшыя з сельскіх мясцовасцей і іншагароднія таксама і інтэрнатам.

11. Увесці для навучаючыхся Рамесленых Вучылішчаў і Чыгуначных Вучылішчаў спецыяльную форму адзення.

12. Абучэнне ў школах Фабрычна-Заводскага Абучэння — бясплатнае. Навучаючыяся школ ФЗА ў перыяд абучэння забяспечваюцца за кошт дзяржавы харчаваннем, бялізнай і спецвопраткай, а прыбыўшыя з сельскіх мясцовасцей і іншагароднія таксама і інтэрнатам.

13. Пасля сканчэння Рамеслепага Вучылішча, Чыгуначнага Вучылішча або школы Фабрычна-Заводскага Абучэння кожнаму навучаючамуся выдаецца атэстат аб сканчэнні вучылішча або школы па форме, устаноўленай Галоўным Упраўленнем Працоўных Рэзерваў, з абавязковым указаннем у ім аб здачы пробы або іспытаў на пэўны разрад па сваёй прафесіі.

14. Устанавіць, што ў Рамесленых і Чыгуначных Вучылішчах павінны быць: дырэктар вучылішча, загадчык вучэбна-вытворчай часткі, выкладчыкі па агульнаадукацыйных і спецыяльных дысцыплінах, адзін старшы майстар на кожнае вучылішча і, апрача таго, адзін майстар па абучэнню прафесіі на кожныя 25 чалавек навучаючыхся.

У інтэрнатах Рамесленых і Чыгуначных Вучылішчаў павінны быць: камендант інтэрната і выхавальнік па ваенна-фізкультурнай падрыхтоўцы, падпарадкаваныя дырэктару вучылішча.

15. Устанавіць, што ў школах Фабрычна-Заводскага Абучэння павінны быць: дырэктар школы, адзін старшы майстар на школу і, апрача таго, адзін майстар на кожныя 30—40 чалавек навучаючыхся.

У інтэрнатах школ Фабрычна-Заводскага Абучэння павінен быць камендант інтэрната, падпарадкаваны дырэктару школы.

16. Устанавіць, што кожнае Рамеслепае Вучылішча, Чыгуначнае Вучылішча і кожная школа Фабрычна-Заводскага Абучэння мае самастойны бюджэт.

17. Дазволіць Рамесленым Вучылішчам, Чыгуначным Вучылішчам і школам Фабрычна-Заводскага Абучэння выконваць элементарныя вытворчыя заказы дзяржавы. Устанавіць, што адна трэць даходаў, атрымліваемых ад выканання гэтых заказаў, а таксама за работу, выкананую навучаючымісяў у працэсе абучэння на вытворчасці, паступае ў дзяржаўны бюджэт, адна трэць астаецца ў распараджэнні дырэктара па расшырэнне вучылішча або школы ФЗА і на культурна-бытавое абслугоўванне навучаючыхся, майстраў і выкладчыкаў і адна трэць выдаецца на рукі навучаючымся, выконваючым работы.

18. Зацвердзіць наступны план размеркавання прызываемых для ўкамплектавання Рамесленых і Чыгуначных Вучылішчаў і школ Фабрычна-Заводскага Абучэння на 1 снежня 1940 года па абласцях, краях і рэспубліках:

Абласці, краі, рэспублікі	Кантынгент навучаючыхся: Рамесленыя вучылішчы	Чыгуначныя вучылішчы	ФЗА	Усяго
Ленінградская	67000	900	9000	76900
Маскоўская	63000	1660	10000	74660
Горкаўская	15000	250	3000	18250
Харкаўская	10000	900	6000	16900
Растоўская	10000	200	7000	17200
Сталінская	8000	810	27000	35810
Свердлоўская	8000	400	8000	16400
Днепрапетроўская	7200	700	7400	15300
Молатаўская	7000	170	3000	10170
Чэлябінская	7000	670	8000	15670
Варонежская	6800	900	5000	12700
Варашылаўградская	6000	—	8000	14000
Новасібірская	6000	850	2000	8850
Азербайджанская ССР	5000	—	5000	10000
Кіеўская	5000	600	6000	11600
Тульская	5000	620	7000	12620
Орлоўская	4750	750	6000	11500
Нікалаеўская	5000	—	3000	8000
Куйбышэўская	4800	—	6000	10800
Сталінградская	4450	250	7000	11700
Запарожская	4500	230	6000	10730
Беларуская ССР	4500	1660	10000	16160
Одэская	4000	400	3000	7400
Яраслаўская	4000	300	4000	8300
Саратаўская	3500	500	2500	6500
Крымская АССР	3000	450	1200	4650
Удмуртская АССР	3000	—	1600	4600
Іванаўская	2800	—	7000	9800
Грузінская ССР	2800	300	1600	4700
Калінінская	2800	550	1500	4850
Краснаярскі край	2600	500	2000	5100
Татарская АССР	1800	—	3000	4800
Смаленская	1700	300	6000	8000
Пензенская	1600	250	2600	4450
Чкалаўская	1500	550	3000	5050
Архангельская	1500	—	2000	3500
Курская	1400	330	2500	4230
Башкірская АССР	1200	350	1200	2750
Карэла-Фінская ССР	1200	—	1000	2200
Іркуцкая	1200	400	3000	4600
Разанская	1200	500	1500	3200
Тамбоўская	1200	630	1000	2830
Сумская	1200	450	800	2450
Чэчэна-Інгушская АССР	1200	—	3000	4200
Омская	1000	800	2000	3800
Прыморскі край	800	300	4000	5100
Казахская ССР	800	1180	3500	5480
Хабараўскі край	550	450	4000	5000
Кіраўская	800	300	4000	5100
Краснаярскі край	800	380	1400	2580
Чыцінская	800	400	1000	2200
Дагестанская АССР	800	—	500	1300
Палтаўская	800	300	1500	2600
Бурат-Мангольская АССР	600	280	600	1480
Армянская ССР	600	—	400	1000
Валагодская	600	200	1400	2200
Жытомірская	400	—	1600	2000
Віницкая	400	430	400	1230
Паўночна-Осецінская АССР	400	200	400	1000
Комі АССР	400	—	400	800
Чэрнігаўская	400	—	600	1000
Алтайскі край	400	250	400	1050
Кіраваградская	400	—	400	800
Мардоўская АССР	400	300	—	700
АССР Немцаў Паволжжа	300	—	400	700
Узбекская ССР	—	600	4000	4600
Туркменская ССР	—	200	1000	1200
Арджанікідзеўскі край	400	250	800	1450
Чувашская АССР	—	200	500	700
Каменец-Падольская	—	—	400	400
Львоўская	—	300	—	300
Ровенская	—	150	—	150

19. Устанавіць, што для Маскоўскай, Ленінградскай, Сталінскай, Варашылаўградскай, Свердлоўскай абласцей, Прыморскага і Хабараўскага краёў і Карэла-Фінскай ССР апрача прызыва (мабілізацыі) гарадской і калгаснай моладзі ў прэдзелах сваёй абласці, края, рэспублікі, — дадаткова выдзяляецца для ўкамплектавання Рамесленых Вучылішчаў, Чыгуначных Вучылішчаў і школ Фабрычна-Заводскага Абучэння, згодна кантынгентаў, указаных у пункце 18 гэтага загада, паступная колькасць прызываемых у вучылішчы і школы з іншых абласцей:

У Маскоўскую абласць — 25.000 чал; у тым ліку:

З Разанскай абласці — 7.000 чалавек.
З Курскай абласці — 7.000 чалавек.
З Орлоўскай абласці — 6.000 чалавек.
З Тамбоўскай абласці—5.000 чалавек.

У Ленінградскую абласць — 36.500 чал.; у тым ліку:

З Беларускай ССР — 13.500 чалавек.
З Калінінскай абласці — 11.000 чалавек.
З Смаленскай абласці—8.000 чалавек.
З Валагодскай абласці—4.000 чалавек.

У Сталінскую абласць — 20.000 чалавек; у тым ліку:

З Татарскай АССР — 5.000 чалавек.
З Беларускай ССР — 4.000 чалавек.
З Палтаўскай абласці—3.000 чалавек.
З Орлоўскай абласці — 3.000 чалавек.
З Курскай абласці — 3.000 чалавек.
З Сумскай абласці — 2.000 чалавек.

У Прыморскі край.

З Новасібірскай абласці — 2.000 чалавек.

У Варашылаўградскую абласць.

З Чэрнігаўскай абласці — 1.700 чалавек.

У Свердлоўскую абласць.

З Башкірскай АССР — 1.300 чалавек.

У Карэла-Фінскую ССР.

З Валагодскай абласці — 1.000 чалавек.

У Хабараўскі край.

З Омскай абласці — 800 чалавек.

20. Асобы, прынятыя ў Рамесленыя і Чыгуначныя Вучылішчы і ў школы ФЗА ў парадку добраахвотнага набору, будуць лічыцца мабілізаванымі і на іх будуць распаўсюджвацца ўсе правы і абавязкі прынятых у парадку мабілізацыі.

Начальнік Галоўнага Ўпраўлення Працоўных Рэзерваў **П. МАСКАТАЎ**

СЛОВА НОВЫХ СОВЕЦКІХ ГРАМАДЗЯН

БРЭСТ. (Кар. «Звязды»). На прадпрыемствах і ва ўстановах горада рабочыя і служачыя горача вітаюць Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб дзяржаўных працоўных рэзервах СССР.

Рабочы друкарні імені Варашылава тав. Чараповіч заявіў:

— 36 год я працую рабочым-наборшчыкам. Сапраўдную радасць працы я пазнаў толькі пры совецкай уладзе. Нам, новым грамадзянам СССР, асабліва відны клопаты партыі, совецкага ўрада, таварыша Сталіна аб добрабыце працоўных. Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб дзяржаўных працоўных рэзервах—яшчэ адно пацвярджэнне гэтаму.

— Указ аб стварэнні працоўных рэзерваў, — сказаў на сходзе паравозпай брыгады станцыі Брэст тав. Кузняцоў, — мае велізарнае гаспадарча-палітычнае значэнне. Каб паспяхова рашыць пастаўленую XVIII з'ездам ВКП(б) задачу — дагнаць і перагнаць і ў эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны, — нам патрэбны матэрыяльныя і людскія рэзервы. На вырашэнне гэтай задачы і накіраван Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета Саюза ССР.

Сходы і гутаркі ў часе абедзеных перапынкаў, прысвечаныя Указу, адбыліся таксама ў арцелях промкааперацыі, у вагонных майстэрнях станцыі Брэст і на іншых прадпрыемствах і ўстановах горада.

РАДАСЦЬ КАЛГАСНАЙ МОЛАДЗІ

Старшыня калгаса «Чырвоны хлебароб», Гомельскага раёна, Нікалай Антонавіч Калугін у гутарцы з карэспандэнтам БЕЛТА заявіў:

— Мы абмеркавалі Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб стварэнні дзяржаўных працоўных рэзерваў СССР на пашыраным пасяджэнні праўлення калгаса. Члены арцелі, асабліва моладзь, поўнасцю адабраюць Указ. Толькі совецкая ўлада так клапоціцца аб будучыні рабочай і калгаснай моладзі. Калгаснікі і іх сыны шчыра дзякуюць совецкі ўрад за клопаты аб іх, за стварэнне выдатных умоў для атрымання кваліфікацыі. Дзесяткі маладых людзей нашай сельскагаспадарчай арцелі з радасцю пойдуць у рамесленыя і чыгуначныя вучылішчы.

Партыйнае жыццё

Выконваюць наказы комуністаў

Справаздачныя сходы ў пярвічных партарганізацыях Варашылаўскага раёна праходзілі на высокім узроўні пры актыўным удзеле комуністаў. Па 153 партарганізацыях на сходах прысутнічала 2.950 чалавек, выступіла ў спрэчках 2.412 чалавек. Комуністы рэзка крытыкавалі асобных кіраўнікоў партарганізацый, выкрывалі недахопы, уносілі прапановы па іх знішчэнню.

Асаблівую цікавасць прадстаўляюць сабой сходы ў партыйных арганізацыях, дзе работа бюро на мінулых справаздачна-выбарных сходах была прызнана незадавальняючай. У Варашылаўскім раёне налічвалася 13 такіх арганізацый. Зараз становішча значна палепшылася. Толькі ў двух партарганізацыях работа бюро прызнана нездавальняючай.

Нездавальняючай была прызнана на мінулых выбарах работа бюро адной з буйнейшых партарганізацый у раёне — партарганізацыі трамвайнага парка. Партыйнае бюро перабудавала сваю работу ў адпаведнасці з наказам комуністаў. Выконваючы галоўнае патрабаванне справаздачна-гыбарнага схода аб паляпшэнні кантроля над дзейнасцю адміністрацыі, партыйнае бюро сістэматычна заслухоўвае справаздачы гаспадарнікаў, аказвае канкрэтную дапамогу ў іх рабоце. На пасяджэннях партыйнага бюро абмяркоўваліся такія пытанні, як планіраванне гаспадаркі, якасць рамонту, павышэнне ролі і аўтарытэта майстра на вытворчасці і т. д.

Партыйнае бюро працуе строга па плану. Комуністам загадзя аб'яўляецца парадак дня партыйных сходаў, указваецца, хто рыхтуе пытанні да яго. У складанні парадку дня прымаюць актыўны ўдзел члены партарганізацыі.

Палепшылася кіраўніцтва комсамольскай работай. За справаздачны перыяд тры разы на пасяджэннях партбюро слухалі пытанні комсамольскай работы.

Многа ўвагі аддавалася выхаванню маладых комуністаў. Партбюро сістэматычна дае кандыдатам партыі даручэнні і кантралёўе іх выкананне. Кандыдату партыі тав. Сяргеевай было даручана праводзіць з рабочымі службы руху чытку газет і гутаркі. Тав. Сяргеева добра спраўляецца з агітацыйнай работай. Добра працуе на былым выбарчым участку агітатар—кандыдат партыі тав. Кавалёва.

Комуністы, выступаўшыя па сходзе, адзначалі таксама і істотныя недахопы ў рабоце партбюро. У трампарку і ў асаблівасці ў інтэрнатах слаба паладжана палітмасавая работа. Нерэгулярна выходзіць насценная газета. Партарганізацыя недастаткова змагаецца за ажыццяўленне Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета ад 26 чэрвеня.

Работа партыйнага бюро трамвайнага парка за справаздачны перыяд прызнана здавальняючай.

Улічыла ранейшыя памылкі бюро партарганізацыі «Гастранома». Яно па-дзелавому занялося паладжваннем партыйнай вучобы. Зараз у арганізацыі няма ні аднаго комуніста, які-б не прапаваў над павышэннем свайго ідэйнага ўзроўню. 4 члены партыі вучацца ў вячэрняй партыйнай школе. 9 комуністаў самастойна вывучаюць «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)». Партбюро сістэматычна кантраліруе вучобу кожнага комуніста. Праведзены 2 тэарэтычныя субяседванні і адна кансультацыя. Комуністы прызналі работу партбюро здавальняючай.

Здавальняючую ацэнку атрымала таксама работа бюро тых партарганізацый, дзейнасць якіх раней была прызнана нездавальняючай, — лямцавай фабрыкі, рэмтрэста, горкомгаса, арцелі імені Крупскай, пажарнай аховы НКВД і іншых.

Аднак ёсць яшчэ і такія партарганізацыі, работа бюро якіх у другі раз прызнаецца нездавальняючай. Бюро партарганізацыі арцелі «Чырвоны ўцільшчык» не зрабіла вываду з наказа комуністаў. Сам сакратар пярвічнай партарганізацыі тав. Чэрчэс не працуе над павышэннем свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню. Член партыі тав. Гуткін зрабіў прагул. Партыйныя сходы рыхтуюцца вельмі дрэнна. Нават справаздачны сход, назначаны на 24 верасня, быў сарван з-за няўкі многіх комуністаў.

Партарганізацыя сістэмы «Мінларок» працуе выключна дрэнна. Тут яшчэ не зжыта кругавая парука, адсутнічае самакрытыка. На справаздачным сходзе асобныя комуністы не выкрывалі, а, наадварот, стараліся замазаць недахопы. Партарганізацыя не мабілізавала калектыў на выкананне Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета ад 26 чэрвеня і 10 ліпеня. Пасля Указа ад 26 чэрвеня было зроблена 9 прагулаў, было многа спазненняў. Дырэктар «Мінларка» т. Коцік пакрывае прагульшчыкаў. У сістэме за 1940 г. было 98 выпадкаў растрат, большасць растратчыкаў не прыцягнута да адказнасці. І аб гэтых абураючых недахопах комуністы чамусьці амаль не гаварылі.

На справаздачных сходах комуністы крытыкавалі райком КП(б)Б за дрэннае кіраўніцтва партарганізацыямі, работа бюро якіх была прызнана нездавальняючай.

Там, дзе зрабілі вывады з наказаў комуністаў, перабудаваліся ў адпаведнасці з імі, партыйная работа ажывілася і палепшылася. І наадварот, дзе працуюць пастарому, там партработа знаходзіцца паранейшаму на нізкім узроўні.

Д. ГУРЭВІЧ,
Інструктар-інфарматар Варашылаўскага РК КП(б)Б.

Пленум Брэсцкага гаркома КП(б)Б

БРЭСТ. (Кар. «Звязды»). Адбыўся чарговы пленум Брэсцкага гаркома КП(б)Б з удзелам сакратароў пярвічных партыйных арганізацый. Пленум абмеркаваў даклад сакратара гаркома партыі тав. Красоўскага аб ходзе выканання пастановы ЦК ВКП(б) ад 10 ліпеня.

Партыйныя арганізацыі Брэста пасля пастановы ЦК ВКП(б) палепшылі работу па прыёму новых членаў партыі і па выхаванню кандыдатаў. Пярвічныя партыйныя арганізацыі станцыі Брэст-Цэнтральны, аблспажыўсаюза, абласнога совета Асоавіяхіма, абласной міліцыі і інш. пачалі лепш працаваць з кандыдатамі партыі, сталі даваць ім партыйныя даручэнні і правяраць іх выкананне.

Большасць кандыдатаў партыі, будучы акружаны ўвагай пярвічных партыйных арганізацый, добра сябе паказваюць на практычнай рабоце, павышаюць свой ідэйны ўзровень, праяўляюць ініцыятыву. Напрыклад, кандыдат партыі тав. Пяскоўская з партарганізацыі аблапа пачала сістэматычна працаваць над «Кароткім курсам гісторыі ВКП(б)», добра сябе паказала як агітатар на былым выбарчым участку, карыстаецца павагай слухачоў. Акуратна пачалі выконваць партыйныя даручэнні і працаваць над павышэннем свайго палітычнага ўзроўню кандыдаты партыі з абласнога совета Асоавіяхіма тт. Ермолава, Мітнік і інш. Пярвічныя партыйныя арганізацыі больш сур'ёзна падыходзяць да пытанняў прыёму новых членаў партыі.

Аднак у партыйных арганізацыях Брэста яшчэ нямала і недахопаў. За два месяцы гарком КП(б)Б адмяніў 8 рашэнняў пярвічных партарганізацый аб прыёме ў партыю.

Партыйная арганізацыя паравознага дэпо налічвае 31 кандыдата партыі, але ні адзін з іх не мае партыйнага даручэння. Гэтая партыйная арганізацыя ні разу не абмяркоўвала пытання аб рабоце з кандыдатамі. Партыйная арганізацыя чыгуначнага тэхнікума прыняла ў члены партыі тав. Базажыева без запаўнення анкеты. Аналагічныя прыклады мелі месца ў партыйных арганізацыях сувязі, 6-й дыстанцыі пуці і іншых.

Выступіўшыя па дакладу тт. Панкевіч (горсовет), Бабаноўскі (заг. оргінструктарскага аддзела абкома), Храмянкоў (горана) прывялі рад прыкладаў дрэннай работы з кандыдатамі і парушэнняў статута ВКП(б) пры прыёме новых членаў партыі.

Пленум патрэбаваў ад бюро гаркома і пярвічных партарганізацый рашуча палепшыць работу з маладымі комуністамі і работу па прыёму новых членаў партыі.

Пленум таксама абмеркаваў арганізацыйныя пытанні. У сувязі з уходам на вучобу другога сакратара гаркома тав. Пастухова пленум аднагалосна выбраў выконваючым абавязкі другога сакратара тав. Кароткага, працаваўшага да гэтага часу намеснікам загадчыка аддзела кадраў абкома.

РАЎНЯЦЦА ПА ПЕРАДАВЫХ!

БРАГІН. (Па тэлефону). Перадавы калгасы Брагінскага раёна набліжаюцца да завяршэння ўсіх сельскагаспадарчых работ. Шырока разгарнулася ўборка бульбы. Ураджай яе выдатны. Кожны гектар даё ў сярэднім па 150—160 цэнтнераў бульбы.

Адначасова з уборкай калгасы прамаполя адгружаюць бульбу ў лік абавязковых паставак дзяржаве.

Узорна працуюць на ўборцы калгасы Хракавіцкага і Крыўчанскага сельсоветаў. Большасць з іх выканалі план ўборкі бульбы на 70—80 процантаў.

Першым у раёне закончыў уборку і здачу бульбы дзяржаве калгас імені Тэльмана, Малейкаўскага сельсовета. Заканчвае ўборку і калгас імені Кірава Крыўчанскага сельсовета: пры плане 95 гектараў ён убраў 79 гектараў. Калгаснікі сельгасарцелі «Ударнік» убралі і здалі дзяржаве 35 тон добрай гатункавай бульбы. Поўнасцю выканалі план паставак калгасы «Другая пяцігодка», Брагінскага пасялковага совета, «Чырвоны росквіт», Крыўчанскага сельсовета, і рад іншых.

Аднак у цэлым па раёну ўборка і здача бульбы дзяржаве зацягнулася. На 1 кастрычніка па раёну ўбрана 1.29 гектараў бульбы, а трэба ўбрать 3.79 гектары. Асабліва адстаюць калгасы Глухавіцкага і Шкуратаўскага сельсоветаў, дзе ўбрана толькі 16—17 проц. усёй пасеўнай плошчы. Калгас «Міхнаўка» Шкуратаўскага сельсовета, з планавых 6 гектараў убраў толькі 4. Яшчэ не пачалі ўборку бульбы ў сельгасарцелі «Чырвоны Кастрычнік», Глухавіцкага сельсовета (старшыня тав. Караньчук).

Марудныя тэмпы ўборкі тлумачацца тым, што ў радзе калгасаў яшчэ не выкаранена антыдзяржаўная практыка: раней ўбіраюць на сваіх прысядзібных участках, а пасля толькі на агульным калгасным масіве.

Уборка не ўсюды спалучаецца з своечасовай здачай бульбы дзяржаве. У калгасе імені Варашылава, Астраглядаўскага сельсовета, убралі ўжо 27 гектараў бульбы, але ні аднаго кілограма не здалі дзяржаве.

Х. ГЛІКІН,
А. КАЦУБА.

Высокі ўраджай на балоце

РУДЗЕНСК. (Кар. «Звязды»). Высокасакавітая атава, густая рупь азімага жыта, разнастайная гародніна, кармавая капуста і новая тэхнічная культура кок-сагыз красуюцца па асушаных балотах тарфяніках. Высокіх ураджаяў на балоце дабіліся калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі «Чырвоная змена». З 4 гектараў авёса намалацілі 11 тон зярна, з 6 гектараў жыта намалацілі 16.830 кілограмаў зярна.

Калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі «Бязбожнік» ужо некалькі год сеюць на балоце зернавыя культуры і кок-сагыз, садзяць бульбу. Сёлета яны сеялі на асушаным тарфяніку 6 гектараў ячменю, 4 гектары пшаніцы, 3 гектары бульбы і гародніну. З кожнага гектара ячменю намалочана па 21 цэнтнеру зярна. З 3 гектараў бульбы калгас атрымае звыш 1.000 цэнтнераў клубняў.

На асушаных і ўгноеных балотах калгаснікі сельгасарцелі «Бязбожнік» упершыню пасеялі 34 гектары азімага жыта.

Днямі пачынаецца ўборка новай тэхнічнай культуры «Крамбэ іспанскае», пасенне якога дае да 45 проц. высокаякаснага пажыўнага масла. Гэта культура вельмі палюбіла балотныя глебы і дае выдатны ўраджай.

Два ўраджаі капусты ў год

У ваколіцах Мінска — у падсобнай гаспадарцы «Навінкі» яшчэ 15 ліпеня знялі ўраджай ранняй капусты. З 0,9 гектара атрымалі 9.124 кг высокаякаснай прадукцыі. Зняўшы раннюю капусту на качарызе пакінулі лісты, на якіх пасля паявіліся адросткі. Праз некаторы час іх пасынкавалі, пакінуўшы па 2—3 адросткі на кожнай качарызе. З гэтых адросткаў выраслі вельмі добрыя качаны капусты, якія пачалі ўжо ўбіраць.

На многіх качарыгах вырасла па два качаны, вагой па 800—1000 грамаў кожны, у той час як качаны першага ўраджаю важылі толькі 700—800 грамаў.

Такім чынам, за адно лета мы атрымалі два ўраджаі капусты.

Агранам ГРАН.

ФЕРМА ВЫСОКІХ УДОЯЎ

У барацьбе за права ўдзелу на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы работнікі малочна-таварнай фермы соўгаса «Лошыца I», Мінскага раёна, дабіліся выдатных поспехаў. Лепшая даярка-стахановка Разалія Лічко надаіла ад кожнай фуражнай каровы сваёй групы (11 кароў) па 4.085 літраў малака. Рэкардыстка «Красуля» за год дала 7.757 літраў малака.

— Да 1937 года на нашай ферме быў нізкі ўдой, гаворыць т. Лічко. — Мы не займаліся па-сапраўднаму раздоем кароў. А ўмелым раздоем можна намнога павысіць удой, нават беспародных кароў. У гэтым я пераканалася. Беспародную «Красулю» я вывела ў рэкардыстку.

Калі карова павышала ўдой, т. Лічко зараз-жа павялічвала ёй рацыён, часцей даіла. Яна пільна сочыць за вымем кожнай каровы, робіць масаж вымені перад даеннем і пасля яго.

Раздой кароў пачалі з арганізацыі працы, з разбіўкі, падбору кароў і замацавання іх за даяркамі.

За кожнай даяркай, замест 16—22 кароў, замацавалі 10—12. Кароў падбіралі па жывой вазе і па прадуктыўнасці. Дарэчы сказаць, каровы на ферме соўгаса нізкапародныя і метысы галандскай пароды. «Красуля» — беспародная. Кожнай карове складаўся рацыён з улікам жывой вагі і колькасці падоенага малака. Улічвалі нават «капрызы» асобных кароў.

З павелічэннем удою каровам дабаўлялася да 10 проц. кармавых адзінак, яны пераводзіліся з трохразовага на чатырохразовае даенне.

Асаблівую ўвагу мы звярталі на своечасовы і правільны запуск кароў, на належную падрыхтоўку іх да ацёлу. Працяг запуску кароў залежаў ад велічыні ўдою. «Красулю» пачыналі запускаць пры ўдоі 15 літраў. Пры запуску паступова змяншалі канцэнтраты і сакавітыя кармы, зніжалі колькасць доек, даілі адзін раз у дзень, потым праз дзень і ўрэшце зусім пераставалі даіць.

Пасля запуску, у кармовы рацыён гэтай каровы ўводзілі канцэнтраты і сакавітыя кармы.

У сярэднім сутачны рацыён для каровы ў сухастойны перыяд складаў: 10—12 кілограмаў грубых кармоў, з іх 3—4 кілограмы сена, да 3 кілограмаў канцэнтратаў і да 15 кілограмаў сакавітых кармоў.

За два тыдні да ацёлу сутачны рацыён каровы паступова скарачалі за лік канцэнтрыраваных і сакавітых кармоў. За 7 дзён да ацёлу ў рацыёне пакідалі толькі адны грубыя кармы.

Правільнае жарменне ў сухастойны перыяд павялічвае ўдой кароў, дае магчымасць атрымаць здаровых, з вялікай вагой пялят, павялічвае жывую вагу кароў і забяспечвае своечасовую злучку.

У выніку праведзеных мерапрыемстваў удой за адзін год па стаду соўгаса павялічыўся амаль у два разы і дасягнуў 3.246 літраў на кожную фуражную карову.

За высокія паказальнікі па ўдою малака соўгас у цэлым і апрача таго даярка-пастух і тэхнік-жывёлавод былі ўдзельнікамі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1939 года і з'яўляюцца ўдзельнікамі выстаўкі гэтага года.

За высокія паказальнікі ўдою карову Разалія Андрэеўна Лічко ўзнагароджана Вялікай залатой медаллю Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. Галоўным таўкомам узнагароджаны і іншыя работнікі соўгаса: пастух Мартын Мартынавіч Катонаў—Малой сярэбранай медаллю, дырэктар соўгаса тав. Сокалаў—Вялікай сярэбранай медаллю.

Соўгас прэміраван дыпломам 1-й ступені, легкавой аўтамашынай і 10 тысячамі рублёў.

У адказ на ўзнагароду калектыў работнікаў фермы соўгаса «Лошыца 1» уключыўся ў соцыялістычнае спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі, абавязаўся ў 1940 годзе атрымаць не менш 3.500 літраў малака на кожную фуражную карову.

М. ВОЛАХАЎ,
старшы зоатэхнік Мінскага абласнога зямельнага аддзела.

УЧОРА І СЁННЯ

Пясчаная дарога ідзе берагам Ісы. Вузкая, заросшая вербалозам і альхою, яна надзвычай маляўнічая. Налева — стромкія сосны, кусты арэшніку, ёлкі. Уперадзе віднеецца вялікі сад, абнесены высокім плотам з белымі цаглянымі слупамі. Скрозь галіны дрэў бялеюць прыгожыя, з калонамі ля ўваходу, будынкі. Гэта — маёнтак «Альбертын», у якім год таму назад жыў граф Паслоўскі, уладар чатырох тысяч гектараў зямлі.

Дарога паварачвае направа, і перад падарожнікам нечакана адкрываецца цудоўная панарама: вялікае возера, па краях якога стаіць векавы бор. Абсаджаная дрэвамі грэбля прыводзіць да карпусоў картонна-папяровай фабрыкі «Альбертын». Год таму назад яна належала акцыянернаму таварыству, у якое ўваходзілі граф Паслоўскі, памешчык Чапскі, дзяльцы-капіталісты Гурвіч і Вайцэхоўскі.

Цяжкім і беспросветным было жыццё рабочых фабрыкі. 270 чалавек працавала на акцыянераў. Акцыянеры выдумлялі розныя спосабы, як больш выкачаць прыбыткаў з прадпрыемства. Зарплата была самай мізэрнай. Адзін з акцыянераў, арандатар Вайцэхоўскі па поўгода і больш не выплачваў рабочым зароблены грошай. Прыходзілася падаваць у суд, каб спагнаць зарплату. А суддзі былі яго прыяцелі. Справа цягнулася годамі, і заўсёды выігрываў яе Вайцэхоўскі, бо не толькі ў ваяводстве, але і ў самой Варшаве ён знаходзіў абаронцаў.

Замест грошай Вайцэхоўскі прапаноўваў рабочым акцыі. Ён хацеў, па англійскаму спосабу, зрабіць рабочых «удзельнікамі» прыбыткаў прадпрыемства. За акцыю вылічвалася па 50 злотых. Калі-ж Вайцэхоўскаму абрыдла гульня ў «акцыянернае таварыства», ён скупіў акцыі. Па гэтай справе ён таксама зарабіў: замест 50 злотых фактычнай каштоўнасці кожнай акцыі, ён выплаціў рабочым па 30 злотых.

— Проша, панове, фабрыка збанкрутавала... Акцыі ўпалі ў цане...

Кожны новапаступаючы рабочы павінен быў адпрацаваць месяц бясплатна. Калі-ж ён паступаў на месца члена стралецкай арганізацыі, на рахунку якога быў доўг у 100 — 150 злотых, з рабочага вылічвалі гэты доўг. Каб мець магчымасць без'уседкага шуму правесці масавае зніжэнне зарплаты, акцыянеры амаль кожны год закрывалі фабрыку і звальнялі ўсіх рабочых. Праз тыдзень або два абвяшчаўся новы набор рабочых, прычым паступалі амаль усе ранейшыя, толькі... на паніжаную зарплату. А рабочы дзень аставаўся ўсё той-жа: 12 гадзін.

Некалькі разоў рабочыя прабавалі баставаць, але кожны раз прадпрыемцы выходзілі пераможцамі: рабочы калектыў быў невялікі, а ў пасёлку Альбертын і ў Слоніме круглы год былі сотні беспрацоўных, гатовых пайсці на любыя ўмовы, толькі-б атрымаць работу. Усё прыходзілася пярпець рабочым: і нізкую зарплату, і забарону саюза, і здзекі майстраў і арандатара, і бесперапынныя штрафы (за 1938 год і да 16 жніўня 1939 года на фабрыцы было аштрафавана 157 чалавек). Гэтаму не відаць было канца.

З кожным годам фабрыка пашыралася, давала ўсё большы прыбытак, а ўмовы працы ўсё пагаршаліся. Асабліва цяжка стала напярэдадні вайны. Фабрыка спынілася. Рабочыя былі асуджаны на галадоўку. І толькі вызваленне Заходняй Беларусі Чырвонай Арміяй павярнула лёс рабочага на новы, шчаслівы шлях.

Па-новаму, па-совецкаму зажылі рабочыя. Першы год вольнай працы даў багатыя вынікі. Валавая прадукцыя на фабрыцы павялічылася на 50 процантаў. Рабочы калектыў вырас больш чым на 50 проц.

Новае вольнае жыццё парадзіла новыя адносіны да працы. З рабскай, прынижаючай чалавека, праца стала справай чэсці, адвагі і геройства. За першы год совецкага жыцця на фабрыцы вырасла 150 стаханаўцаў, якія выконваюць нормы на 150—200 проц.

Ля папяровай машыны стаіць рабочы Васіль Максімавіч Карповіч. Бацька яго ў 1920 годзе, калі тут была совецкая ўлада, працаваў у міліцыі. За гэта паны кінулі яго ў турму. Вышаўшы з турмы, ён нідзе не мог знайсці работы. За ім увесь час сачылі. У часе вайны ў мінулым годзе 73-гадовага старога зноў арыштоўваюць і кідаюць у Картуз-Бярозу, адкуль яго вызваліла Чырвоная Армія. Васілю Іванавічу, сыну «падазронага», таксама прыходзілася нялёгка. З дванаццаці год ён пайшоў працаваць на запалкавую фабрыку. Калі падрос, стаў працаваць лесарубам у лясах графа Паслоўскага, рэзаў гонт, быў падвозчыкам вугалю на фабрыцы, потым стаў рольшчыкам. З устанаўленнем совецкай улады яго вылучылі майстрам папяровай машыны. Сваю норму ён выконвае ў паўтара раза.

Чацвёра дзяцей Васіля Максімавіча ходзяць у школу, старэйшая дачка працуе настаўніцай.

У макулатурным цэху працуе брыгадзірам маладзёжнай брыгады Марыя Максімаўна Казлоўская. Вызваленне краю дало ёй, як і іншым работніцам, шчаслівую долю. Нарадзілася Марыя пад Стаўбцамі. Бацька быў за кучара ў памешчыка Незабыткоўскага. Марыі было дзевяць год, калі памерлі бацькі. Яна асталася з пяцю сёстрамі і братам. Дзеці разышліся, хто куды: да паноў, да кулакоў. Марыя батрачыла шэсць год у кулакоў. А потым прыехала ў Альбертын, паступіла на кухню да Паслоўскага. За пятнаццаць злотых у месяц яна працавала па 16 гадзін у дзень. Больш года не вытрымала, пайшла на лесапільню да таго-ж Паслоўскага, а потым на панскую гародню. Калі фабрыка стала народнай, Марыю прынялі сюды на работу. Яна стала стаханаўкай. У маі гэтага года ўступіла ў комсамол. А потым ёй даручылі кіраваць маладзёжнай брыгадай. Брыгада яе з'яўляецца перадавой, перавыконвае сваё заданне. Марыю прэміравалі і паслалі ў дом адпачынку.

У гэтым годзе рабочыя ўпершыню атрымалі адпачынак, многія пабывалі на курортах. Адкрыта амбулаторыя, якая аказвае бясплатную медыцынскую дапамогу. Шэсцьдзесят тры рабочыя сем'і атрымалі кватэры ў дамах Паслоўскага. За кошт фабрыкі ўтрымліваецца дзіцячы сад. Кожны рабочы атрымаў сёлета гарод, аб чым раней і заікнуцца нельга было перад гаспадарамі. Ёсць клуб, у якім працуюць розныя гурткі, бібліятэка, парк, побач з фабрыкай — прыгожае возера, у якім пры панах забаранялася лавіць рыбу і купацца.

Высокая прадукцыйнасць працы рабочых дала магчымасць перавыканаць план. Так, жнівеньскі план быў выканан ператрымінова — 27 жніўня. Звыш плана фабрыка дала 72,5 тоны картона.

За месяц да дня гадавіны вызвалення Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны рабочы калектыў фабрыкі выліжаў на социялістычнае спаборніцтва працоўных Баранавіцкай абласці на дастойную сустрэчу вялікага свята. Са свайго боку рабочыя паставілі перад сабой задачу павялічыць валавы выпуск прадукцыі за кошт далейшага ўзыму прадукцыйнасці працы, а да дня свята—даць краіне звыш плана 76 тон картона. Гэтае абавязацельства рабочы калектыў з чэсцю выканаў.

Дзень і ноч гудзяць фабрычныя машыны, дзень і ноч падаюць з папяровай машыны квадратныя лісты добраякаснага картона. І ў цэху бегуноў, і ў механічным, і ў лесапільным, і ў сталярскім, і ў парасілавым, і ў цэху складаных папяровых машын, дзе па сукну цягнецца доўгая істужка масы, і ва ўпаковачным — усюды кіпіць работа. Новы, совецкі Альбертын жыве поўнакроўным жыццём, упэўнены ў сваёй будучыні.

Цім. ЗАРЭЧНЫ.

г. Слонім.

Стаханаўка двухстаночніца-ткачыха ваціна-ватнага камбіната (г. Беласток) Л. Сіскевіч сістэматычна выконвае норму на 120—130 проц. Тав. Сіскевіч нядаўна ўступіла ў ЛКСМБ. Фото А. Сапіра. (Фотахроніка БЕЛТА).

НАША РОДНАЯ КРАІНА ЖЫЦЦЁМ, РАДАСЦЮ ПАЎНА

(Частушкі)

Мы пяем і весялімся,
Мы нікога не баімся,
Нас ніхто не забярэ,
Нас бароніць СССР.

Дзякуй Сталіну радному,
Што прыслаў свабоду нам,
Дзякуй Арміі Чырвонай
І яе правадырам.

Вочы весела глядзяць,
У сэрцы радасць расцвіла,
Калі сталінская сіла
Нам свабоду прынясла.

Упякаючы, паны
Пакідалі кафтаны,
І сюртук і капялюш.
Цяпер нас ніхто не руш!

Не адзін мы хлеб ядзім,
Ёсць да хлеба й сала.
Дзякуй, Сталін, дзякуй, родны,
Жыць шчасліва стала.

Я, дзяўчынка маладая, —
Комсамолкай мяне звуць,
Нам дарогі ўсе адкрыты,
Вольна жыць і працаваць.

Пры панах насіў халат,
Страх — на лаце лата;
Цяпер новенькі пінжак
У нашага Ігната.

Нас цяпер жыццё галубіць,
У шчасці радасна жывём.
Мы работаем і любім,
І пра Сталіна пяём.

Весялімся і гуляем,
«Лявоніху» скачам,
Як паноў папраганялі, —
Больш ужо не плачам.

Я па садзіку хадзіла,
Сабірала кветкі.
Пяе моладзь, старыкі,
Весяляцца дзеткі.

Дзе ні выдзеш, дзе ні глянеш, —
Сонца сцежку сцеліць нам.
Тут старык малодшым стане,
Тут краіна Леніна.

Мы гуляем і спяваем,
Нам не страшна працаваць,
Па-стаханаўску мы будзем
Жыццё нова будаваць.

Сёння сонца засвяціла,
Нам не страшны ўжо мароз.
— Вы, таварышчы, не спіце,
Закладайце свой калхоз.

Гэй, цвіці, спявай, старонка,
У гэту светлую вясну.
Свеціць табе ўжо зорка,
Як у дарагім Крэмлю!

Славім новае жыццё мы,
Новы лад большэвікоў,
Бо пад сталінскім законам
У нас не будзе беднякоў.

Мы Кастрычнік сустракаем, —
Павявай, чырвоны сцяг.
У нашым сэрцы Ленін, Сталін
Зоркай яснай зіхацяць.

Запісана ў розных раёнах заходніх абласцей БССР.

Новыя кнігі для дзяцей

Аддзел дзіцячай літаратуры Беларускага дзяржаўнага выдавецтва пры СНК БССР выдаў рад кніг на беларускай мове для дзяцей.

Выйшлі з друку і паступілі ў продаж кнігі: М. Лынькова — «Ядвісін дуб» і «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышоў»; Змітрака Бядулі — «Хлопчык з-пад Гродна»; М. Горкага — «Песня аб сокале»; раман М. Паслядовіча — «Паўстанне»; казкі І. Кіпніса — «Разумны заяц», у перакладзе з яўрэйскай мовы З. Цырліна.

ФЕЛЬЕТОН

Культурны Рычард

Знаёміцца ён так:

— Мяне завуць Рычард.

Пры гэтым твар яго прымае гордае выражэнне, у вачах блішчаць іскрачкі перавагі над усім навакольным. Ён папраўляе свой гальштук колеру кофе з малаком і кідае позірк на свае жоўтыя туфлі, начышчаныя да такога блеску, што ў іх адлюстроўваецца папяроса, якую ён трымае ў руках.

Ён называе сябе Рычардам, хоць сапраўднае яго імя Грыгорый. Але такое празаічнае імя, як Грыгорый, яго не задавальняе. Ён любіць узвышанае, крыклівае і, як ён аднойчы выразіўся, раманцтычнае. Выбраў ён сабе імя Рычард вось пры якіх акалічнасцях. Адзін таварыш па сумеснай рабоце ва ўстанове расказаў яму аб прачытанай кнізе Вальтэра Скота «Рычард Львінае сэрца».

— Цудоўна! Вельмі падыходзіць, — заўважыў наш герой.

— Што цудоўна? Ты хіба чытаў гэтую кнігу? — запытаў таварыш.

— Не аб кнізе гутарка. Я яе не чытаў і не збіраюся чытаць. Імя цудоўнае!

— Якое імя, Грыгорый? Аб чым ты гаворыш?

— З сёнешняга каляндарнага чысла я табе не Грыгорый. Я — Рычард! Зразумеў? Ры-чард. Запамятай. І калі хочаш— Львінае сэрца...

Рычард лічыць сябе культурным чалавекам. Апрапут ён заўсёды з шыкам, як гаворыцца, з іголачкі. Усё на ім блішчыць, ззяе. Вертыкальныя складачкі на яго бруках ніколі не бываюць выхаднымі.

Гуляе ён аднойчы па вуліцы з мілай такой бландынкай, вочы якой напамінаюць бязвоблачнае неба. Гаворыць ён аб тым, аб сім, аб зорках, аб зззянні месяца, аб кітайскім фарфары і сусветнай драматургіі.

— Люблю Шэкспіра. Разумееце, Ліза, такая глыбіня чалавечых пачуццяў, такая, ведаеце, сіла чалавечых перажыванняў! Так у яго, у Шэкспіра значыць, паказана каханне — сапраўды мацней смерці. Нічога не скажаш. — Ён зрабіў невялікую паузу. Крыху задумаўся. Здавалася, ён знаходзіцца зараз у палоне ўсёпакараючага майстэрства вялікага драматурга.

Ён паглядзеў на сваю спадарожніцу. Яго погляд быццам гаварыў:

— Бачыце, як тонка я разбіраюся ў пытаннях літаратуры і мастацтва. Шэкспіра наскрозь бачу.

— А што вы глядзелі з шэкспіраўскіх спектакляў? — нечакана запытала Ліза.

— Я глядзеў трагедыю... Ну, ведаеце... Тую, аб якой гавораць, што няма больш сумнай аповесці на свеце... Вось з галавы вылецела назва... Ляжыць на языку і не магу выгаварыць... Забыўся...

— Можа, трагедыя, дзе Джульета... — лёганька прыкусваючы ніжнюю губу, сказала Ліза.

— Вось іменна. Я гэта і хацеў сказаць. Джульета і Отэло. Не, наадварот — Отэло і Джульета... Правільна! Як зараз, перад маімі вачыма сцэна аб'яснення ў каханні Отэло з Джульетай. Якая сіла страсці! Якая глыбіня...

Ліза яго перабіла...

— Вы, відаць, пераблыталі, Рычард. У Шэкспіра няма такой п'есы Отэло і Джульета. Ёсць Ромэо і Джульета, а Отэло — гэта само сабой. Самастойная п'еса...

Рычард спачатку крыху разгубіўся. Пасля ўзяў сябе ў рукі, пракашляўся і, як ні ў чым не бывала, ласкава-мядовымі вачыма паглядзеў на Лізу і сказаў:

— Не хачу з вамі спрачацца. Можа сапраўды пераблытаў.

Як вопытны субяседнік, ён адразу пераключыў гутарку, як гаворыцца, на новыя рэйкі.

— Вазьміце оперу. Вы сабе не ўяўляеце, як я люблю оперу. Сядзіш у зале і слухаеш чароўную музыку. І здаецца, хвалі гэтай музыкі плывуць па залу, яны падхватваюць цябе і нясуць, нясуць... — Ён глыбока ўздыхнуў, зрабіў задумлівае выражэнне твару. Пасля прадаўжаў.

— Нядаўна адзначалася ў нас стагоддзе з дня нараджэння вялікага рускага кампазітара Чайкоўскага. Вось гэта быў геній! Вяршыня музыкальнай культуры!

Слухаў я неяк яго оперу «Кармен». Дык, паверыце, гэта нешта асаблівае, патрасаючае...

— А даўно вы слухалі «Кармен» Чайкоўскага? — сур'ёзным тонам запытала Ліза.

— Як вам сказаць. Месяцы чатыры таму назад.

Тут Ліза не вытрымала. Яна гучна рассмяялася.

— «Кармен»... Чайкоўскага... Ці ведаеце вы, аматар музыкі, знаўца мастацтва, што оперу «Кармен» напісаў кампазітар Бізэ. Так, так, Бізэ. Уявіце сабе...

Рычард больш не сустракаецца з Лізай. Гэта-ж не дзяўчына, а поўная кампраметацыя культурнага чалавека. Яна вельмі многа разумее, гэтая Ліза. Скажыце, калі ласка...

Днямі мы сустрэлі нашага героя на танцавальнай пляцоўцы. Ён вялікі аматар танцаў і лічыць, што ўвесь свет трымаецца на трох кітах: румбе, факстроце і танго.

Ён быў у клятчатым касцюме. Гладка прычасаныя валасы. Акуратна завязаны гальштук. Ён сабе вельмі падабаўся ў гэты вечар.

Танцуючай паходкай ён падышоў да адной дзяўчыны, нізка пакланіўся.

— Мяне завуць Рычард. Калі не памыляюся, мы дзесьці з вамі сустракаліся. Здаецца між румбай і танго. Вось не памятаю толькі на якой пляцоўцы. Калі хочаце, пройдземся крыху, пасля патанцуем.

Яны ішлі і гаварылі. Вярней гаварыў ён, а яна слухала. Ён залязаў у завоблачныя вышыні паэзіі і музыкі, пасля спускаўся на зямлю і гаварыў аб архітэктуры і водных каналах. Яна слухала ўважліва. Ён настойліва прасоўваўся па джунглях розных узвышаных рэчаў, праклаўваючы сваім языком шлях да сэрца дзяўчыны.

— Скажам, калі ўзяць Мікела і Анджэлава. Гэта-ж геніі! Дваюрадныя браты такія былі. На ўсе рукі майстры. Чулі можа быць?

— Якія браты? Чаму дваюрадныя? Аб чым гаворыце? — са здзіўленнем запытала дзяўчына. — Мікель Анджэла Буонароці — гэта адзін чалавек. Італьянец. Ён сапраўды быў і скульптар, і архітэктар, і жывапісец, і паэт. А вы выдумалі нейкіх дваюрадных братоў.

— Выбачайце, — сказаў Рычард. Можа я сапраўды пераблытаў. Ведаеце што, пойдзем станцуем факстрот. Пакінем гэтыя разгаворы.

— У мяне няма зараз настрою танцаваць. Пайду дамоў.

Яна развіталася і пайшла.

Ён пастаяў крыху, заліхвацка плюнуў і пайшоў на пляцоўку, насвістваючы нешта з цыганскага раманса.

У адзін з вечароў Рычард сядзеў з дзяўчынай у кінотэатры, на трэцім сеансе. Ён гаварыў аб кіномастацтве, аб фільмах-шэдэўрах, аб славутых артыстах і артыстках.

— Барыса Чыркова ведаеце? Гэта — сапраўды артыст. Вазьміце яго іграу «Шукальніках шчасця». Ён там іграе Піню. Гэта-ж адно захапленне! Або такі артыст, як Нікалай Чэркасаў. Народны артыст рэспублікі. Які дыяпазон! Асабліва ён мне падабаецца ў «Балтыйцах».

— Паслухайце,—піха сказала дзяўчына, — вы, здаецца, крыху памыляецеся. Ролю Піні ў «Шукальніках шчасця» іграе не Чыркоў, а Зускін. А Чэркасаў іграе не ў «Балтыйцах», а ў «Дэпутаце Балтыкі»...

Пасля выхаду з кінотэатра дзяўчына сказала Рычарду:

— Вы многа гаворыце пра кіно. Але вы-ж бязбожна блытаеце карціны і артыстаў. Скажыце адкрыта — вы глядзелі тыя фільмы, аб якіх гаворыце?

Рычард апусціў галаву, валасы яго ўпалі на лоб. Ён нічога не адказаў...

С. КУНЯЎСКІ.

Змітрок БЯДУЛЯ

СЯРЭБРАНАЯ ТАБАКЕРКА

(Урывак з аповесці)

Як толькі кончылася вячэра, дзед сумленна прыступіў да працягу дзіда-дзедаўскай гісторыі.

— Эге! — прамовіў дзед. — Наш дзіда-дзед спакойненька канцыбаў да хаты, нібы яго жыта ў ток павалочана і памалочана. Шугае сабе хмызнячком, аж чуе — блізка сучкі хрушчаць. Дзіда-дзед настаражыўся. Зірнуў у адзін бок, у другі — бачыць каса блішчыць. Па сонцы яна так зіхаціца, што вочы слепіць. Што за касец? — думае дзіда-дзед. — Паплавы скошаны. Унь стагі стаяць. Хіба атаву косіць?

Не бачыць дзіда-дзед касца, кусты заслаяюць. І відзець касца не хоча. Ты яму рубля дасі, а ён усёроўна тваім кумам не стане. Яшчэ па неасцярожнасці вуха адцяпне. Лепш не шапкавацца з ім — з каспом.

Паверне дзіда-дзед направа — і каса рухаецца да яго направа. Паверне дзіда-дзед налева — і каса рухаецца да яго налева.

Значыць, касец бачыць яго і пнецца сюды паміж кустоў. У дзіда-дзеда сэрца задрыжэла, нібы на нітачцы вісела. Ён спузіўся толькі на хвіліну. Хацеў ён кінуцца на каспа, як раней на стральца. Але пры такой блізкасці каса горш за стрэльбу — зарэжа і дзякуй не скажа. А што тады будзе з дарагой табакеркай?

Не паспеў ён азірнуцца — ажна касец перад ім — нос у нос...

Дзіўны касец. Ахутаны ўвесь у чорную хустку, як баба, а спаміж хусткі толькі доўгі нос тырчыць, прыгнуты і завостраны, нібы дзюба ў каршуна. Дзіда-дзед падумаў: «З гэтай цёткай я не спраўлюся. Яе перахітрыць нельга. Не па маёй лапцы рукавіца».

— Хто-ж гэта быў? Хто? — не выцярпеў ўнукі.

— Хто? Гэта была сама смерць, каб вам не зманіць, — тлумачыў дзед. — Наш дзіда-дзед гэта адразу зміркіў. У тыя даўнія годы смерць хадзіла па зямлі, зусім не тоячыся.

«Прапала маё жыццёйка, — падумаў дзіда-дзед. — Дай хоць перад канцом сваім панюхаюся тытуну. На тым свеце можа і не далуць».

Дастаў ён табакерку, нюхае і чхае, чхае і нюхае. А смерць да яго кажа:

— Добры дзень, дзядзенька!

— Добры дзень, цётанька! — адказвае дзіда-дзед, здымае шапку і нізка-нізка кланяецца. А ў самога каленкі — дрыж-дрыж... Яму і гаварыць цяжка і ад страху, і ад тытуну. Ён бесперапынку чхае.

Смерць зноў звяртаецца да дзіда-дзеда:

— Які слаўны сёння дзянёк! га?

Дзіда-дзед трымае фасон і адказвае ў тон:

— Вельмі, апчхі, харошы, апчхі, дзянёк! Апчхі, апчхі, апчхі!

— Дай, — кажа смерць, — тытуну панюхаць.

Дзіда-дзед падсунуў табакерку.

— Нюхай! Калі ласачка... Апчхі, апчхі! — а ў самога аж дух заняло.

Высунула смерць з-пад чорнай хусціны тонкія пальцы, лезе ў табакерку ды ніяк тытуну дастаць не можа. Носам, як той бусел, цэліцца ў адчыненую табакерку — не трапляе.

Вінаваты быў зноў-жа дзіда-дзед, няхай яму будзе пуховай падушачкай зямелька родная. Рука з табакеркай у яго ходарам хадзіла ад страху.

Тады дзіда-дзед кажа:

— Лезь, ягадка мая, у табакерачку! Нюхай, нюхай на міласць колькі ўлезе. То не полудзень і не вячэра, але будзе сыта цяцера. Я не скупы, свайго дабра не шкадую. А дома ў мяне тытуну, як у князя — аж цэлы куфар. Адсыплю на памяць. А вясной мультанку пасаджу і на тваю долю... Пампушы пад страхой павешу. А потым спірытусам апырскаю... мядком аздоблю. Навучу цябе церці лісты ў пылок... Эх, будзе тытунок! Як гэта кажуць, дзела дзельніка паважае.

Дзіда-дзед хацеў роднымі хітрыкамі адцягнуць сваё жыццёйка, як кароўку за рогі, яшчэ на гадок — і падлабуньваўся салодкімі слоўцамі. Як топішся, дык за цюцькін хвост хопішся. Эге! І што вы, мае міленькія, скажаце? Смерць з касою драбнела, драбнела, драбнела... Зрабілася малюсенькая, як павук, а каса — як павуцінка, ускочыла ў табакерку, нюхае і хваліць тытун на ўсе лады.

— Нюхай, цётухна, нюхай! — гасцінна просіць дзіда-дзед. — Не спяшайся, цётухна! Трэба нюхаць павольненька. Тады яшчэ смачней.

Хітруном быў мой дзіда-дзед. Улегчы яго не возьмеш — о-го-го! У яго галаве стрэльнула адразу адважная думка-стрэльбачка. Доўта не думаючы, ён табакерку трах-тарарах і зачыніў яе. Стоп, цётачка Аўтіня! Цяпер маё жыццё не загіне.

Залясканала, залапатала, забалбатала смерць у зачыненай табакерцы, як тая мыш, што папала ў глыбокі гладыш.

— Не жартуй, дзядзька! Адчыні вароты, — зачмыхала яна спалохана.

А дзіда-дзед на гэта:

— Зусім не жартую!

А смерць да яго:

— Як загневаюся, горш будзе.

Дзіда-дзед засмяяўся:

— Гневайся, не гневайся — даражэй за тытун не заплоціш.

Тады смерць залямантавала і ўзмалілася жаласлівым галаском:

— Выпусці, родненькі, выпусці, родненькі...

Дзіда-дзед зазлаваўся:

— Які я табе родненькі? Мы з табой пажаніліся, ці што?

Горка плача смерць:

— Выпусці, папочку... Выпусці, папочку...

Яшчэ больш загневаўся дзіда-дзед:

— Які я табе па-но-чак? Маёнтак у мяне, ці што? За цівуна цябе наняў, ахмістрыняй ты ў мяне, ці што? З бедных людзей здзекуюся, ці што?

А смерць просіць:

— Злітуйся, злітуйся... Будзь сябрам...

Аж нагой тупнуў дзіда-дзед:

— Які я табе сябр? Не магу быць сябрам такой гадзіны...

— У мяне так шмат працы, — галосіць.

— Прападзі ты са сваёй працай! — закрычаў дзіда-дзед на ўвесь голас. — Дзіда-дзед сыпаў ядраными лаянкамі не менш гадзіны, аж пакуль язык забалеў і голас асіп. Смерць у табакерцы прытаілася і пярпліва маўчала. Пакрысе дзіда-дзед адышоў ад злосці. Яму раптам так захацелася тытуну панюхаць, так захацелася — хоць самому лезці носам у табакерку... Ён, вечнай памяці, узяўся за табакерку, бо на хвіліну забыўся, хто ў ёй сядзіць. Па натуры ён быў зусім не злы.

Дзед спыніў апавяданне і з хітрай усмешкай зірнуў на ўнукаў.

— Ой, — спалохана ўскрыкнулі зайчанёнак і зайчанятка. — Ой, дзіда-дзед выпусціў смерць з табакеркі...

Дзед засмяяўся, нанюхаўся з табакеркі і сказаў:

— За каго вы мяне маеце? Я-ж гэтага не казаў. Дзіда-дзед лезь не выпусціў, але ўпору ачухаўся ды ўспомніў на якім ён свеце. Ого, дзіда-дзед! Такі разумнік... Ён у тую хвіліну вяровачкай аплёў табакерку, каб раз назаўсёды зарубіць сабе бірку на носе аб тым, хто ў ёй сядзіць. На хвіліну смерць нават абрадвалася, думала, што дзіда-дзед заваружыца і незнарокам выпусціць птушачку з клеткі, калі яму захочацца тытуну панюхаць. Потым хітрая смерць адчула, што ёй тут не хаханькі. «Дам яму хапу ў лапу» — падумала яна. Голас яе зрабіўся салодкі, як мёд:

— Давай, шаноўны Заяц Зайцавіч, найвышэйшае правасхадзіцельства, не будзем больш сварыцца. Калі ў гаспадарцы сварацца, у гаршку трасца варыцца. Зробім такую ўмову: калі выпусціш мяне на волю, — я на векі-вечныя зайцаў чапаць не буду. Твайго роду-племені ніякія кулі не возьмуць, ніякія стральцы і гончакі нічога з зайцамі не зробяць. Згодзен? Я ў палоне ў тваёй табакерцы, а твая табакерка — у палоне ў мяне, і ты з яе не можаш нюхаць. Цяпер-жа твая табакерка зусім не табакерка, а нямаведама што... Выпусці мяне на волю і не буду чапаць тваіх.

— Так табе і паверу, — артачыўся дзіда-дзед. — Дурня знайшла.

І дзіда-дзед пачуў урачысты голас палонніцы:

— Клянуся сваёй касой!

У гэты час дзіда-дзеда нешта смактала ўнутры, нібы п'яўка. З гэтай табакеркі і тытун яму здаваўся смачнейшым. Аднак ён сказаў:

— Дуджі! Не выпушчу з буджі.

— Ведаеш што, яснавяльможны мой,— пачуў ён з табакеркі найдабрэйшы на свеце галасок: — Апрача таго, што я твайго роду ніколі чапаць не буду, дам табе яшчэ адзін багаты падарунак, клянуся касой...

— А які? — зацікавіўся дзіда-дзед.

— Дарую табе сто чалавечых жыццяў. Выбірай каго хочаш. Прыкінься доктарам. Захварэе які-небудзь кароль, граф, магнат, мільянер, і калі ўжо ніякія дактары яму не дапамогуць, — ты да яго з'явішся і скажаш: «Алдасі мне палавіну свайго багацця, і я выратую цябе ад смерці» Ты мне толькі табакеркай махнеш, вокам міргнеш, і я таго чалавека чапаць не буду. Разбагацеешь, як ніхто на свеце, клянуся касой! Ну, як? Згодзен?

— Дуджі! — сказаў дзіда-дзед. — Не выпушчу з буджі! Не толькі сто чалавечых жыццяў — тысячу і мільён дасі! Лепш маўчы, рыбка ты мая залатая. Колькі ні танцуй казачка — не аддарвешся ад майго кручка. Ведай, стары цвіркунок, свой новы шастак! І без тваёй сардэчнай ласкі буду мець цяпер усё, што толькі захачу. Але мне патрэбна толькі адно — твая няволя, твае пакуты, твае слёзы. Каб сабраць усе слёзы, пралітыя тваёй касой, дык у іх можна выкупаць усю зямлю, нібы дзіпё ў начоўках з вадой. Крывёй, пралітай табою, можна ўсё неба афарбаваць. Праклёнамі, што на цябе сыпаліся спакон вякоў, можна пагасіць сонца, месяц і зоркі. З магільных помнікаў на ўсім свеце можна пабудаваць шмат вялізных гарадоў...

Дзіда-дзед крыху памаўчаў, каб адсапнуцца. Потым загаварыў далей:

— Не! Не! Не! Хоць ты мяне госпадам богам сваім назаві, не выпушчу на волю! Якраз паводле кабылкі хамут. Табакерка? Зраблю табакерку з нашай слаўнай бяросты. Буду нюхаць тытун і нічатусенькі! А ты будзеш у мяне за пазухай сядзець, як у бога, і чхаць мне на весялосць. На дно мора я цябе не кіну, бо рыба прагрызе табакерку і ты выскачыш. На высокую гару я цябе не панясу, бо птушкі раздзяўбуць табакерку і ты выскачыш. У зямлі я цябе не пахаваю, бо іржа праб'е сценкі табакеркі і ты выскачыш. Буду трымаць цябе ў табакерцы за сваёй пазухай на векі-вечныя, і нічога са мной зрабіць не зможаш... Чуеш?

— Чую, — сказала смерць і заскрыгатала зубамі.

— Можаш скрыгатаць зубкамі колькі хочаш, не баюся цябе! Палажу галку на голую лаўку. Не баюся цябе! Не баюся! — голас дзіда-дзеда быў радасны, як ніколі. — Абмажу сценкі табакеркі такім маслам, якое не дасць іржавець серабру. А зверху абалью табакерку гарачым шклом. Потым пайду да каваля, і ён закуе табакерку ў моцную скрыначку з сталі.

Радасць дзіда-дзеда расла з кожным словам.

— Ты нават не пачуеш, што дзеецца на свеце. Ніякія гукі зямлі да твайго слуху не дойдуць. Ты будзеш жадаць, каб табе падышоў канец, але ён не падыйдзе. Ты захочаш сабе самой галаву адкусіць і ўкусіш сябе толькі за палец. Ты будзеш пакутваць горш за тыя мільярды мільярдаў жывых істот, якіх ты сцёрла ў пылок.

ЗА РУБЯЖОМ

Англа-германская вайна

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 5 кастрычніка. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай арміі паведамляе:

Учора, не гледзячы на выключна неспрыяючыя метэаралагічныя ўмовы, моцныя злучэнні нашай авіяцыі паспяхова бамбардыравалі важныя ў ваенных адносінах аб'екты Лондана і ваколіц. У Сіці і на паўночным беразе Темзы ўзнікла многа пажараў. Пашкоджаны таксама чыгуначныя збудаванні паблізу Каледж-Парка. Далейшыя налёты былі накіраваны супроць партовых збудаванняў, ваенных прадпрыемстваў, буйных нафтасховішчаў, чыгуначных аб'ектаў і аэрадромаў у Паўднёвай і Цэнтральнай Англіі. У ангарах і сховішчах адбыліся ўзрывы і ўзнікла многа пажараў. На аэрадроме ў Пенрозе (ля праліва Св. Георгія) удалося разбурыць наземныя збудаванні і знішчыць некалькі самалётаў.

Ваенна-марская артылерыя прымусіла павярнуць назад вышаўшы з Дуўра караван англійскіх суднаў.

4 і ў ноч на 5 кастрычніка англійскія самалёты не заляталі ў Германію. Акрамя знішчаных на зямлі, працаўнік страціў у баі 5 самалётаў. Пяць германскіх самалётаў не вярнуліся на базы.

БЕРЛІН, 5 кастрычніка. (ТАСС). Як перадае германскае інфармацыйнае бюро, буйныя злучэнні германскіх самалётаў падверглі ўчора моцнай бамбардыроўцы рад аэрадромаў і воінскіх казарм у Сярэдняй і Паўднёвай Англіі, а таксама і Шатландыі. Сур'ёзна пашкоджан аэрадром ва ўсходняй частцы Лондана. У Шатландыі адзін аэрадром знішчан, усе наземныя збудаванні знесены, а знаходзіўшыяся ў ім самалёты прыведзены ў нягоднасць.

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 5 кастрычніка. (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што ўчора англійская авіяцыя бамбардыравала ваенныя аб'екты на акупіраваным праціўнікам галандскім узбярэжжы.

Германскія самалёты, якія дзейнічалі ў адзіночку і скрываліся ў аблаках, правялі беспарадачную бамбардыроўку галоўным чынам Паўднёва-Усходняй Англіі. Асобныя германскія самалёты скінулі таксама некалькі бомб у раёне вусця Темзы і над Усходнім Лонданам.

Англійская ваенна-марская авіяцыя бамбардыравала над нарвежскім узбярэжжам некалькі стаяўшых на якары транспартных суднаў водазмяшчэннем ад 4 да 5 тысяч тон кожнае. На адным судне ўспыхнуў вялікі пажар. У раёне Б'ерне-Фіёрда скінуты бомбы на непрыяцельскае транспартнае судно водазмяшчэннем каля двух тысяч тон. Мяркуюць, што судно патанула.

Як перадае агенцтва Рэйтэр, у ноч на 5 кастрычніка германская авіяцыя напала па 60 пунктаў Лондана і Паўднёва-Усходняй Англіі. Бамбардыроўка была яшчэ больш беспарадачнай, чым у папярэднія ночы. Учора знішчана тры германскіх бамбардыроўшчыкі. Англійская авіяцыя страціла адзін знішчальнік.

Надзвычай неспрыяючыя метэаралагічныя ўмовы перашкодзілі англійскай бамбардыровачнай авіяцыі зрабіць у ноч на 5 кастрычніка налёт на ваенныя аб'екты праціўніка.

ЛОНДАН, 5 кастрычніка. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр абвяргае паведамленне Германскага інфармацыйнага бюро, у якім гаворыцца, што пачынаючы з другога тыдня жніўня збіта 2.400 англійскіх самалётаў. У лонданскіх кругах заяўляюць, што, паводле даных англійскага міністэрства авіяцыі, з 8 жніўня Англія страціла ўсяго 584 самалёты, а германская — 2.211. Пры гэтым адзначаюць, што 317 лётчыкаў з экіпажаў 584 збітых англійскіх самалётаў выратаваліся.

Англа-амерыканскае супрацоўніцтва

ЛОНДАН, 5 кастрычніка. (ТАСС). Нью-йоркскі карэспандэнт газеты «Дэйлі мейл» паведамляе, што ў выніку перагавораў паміж Хэлам, англійскім паслом у ЗША Лаціянам і аўстралійскім пасланнікам Кэсей дасягнута англа-амерыканскае пагадненне аб аб'еднаных дзеяннях у Ціхім акіяне. Афіцыяльнага паведамлення не будзе, пакуль не стане вядом вынік прэзідэнцкіх выбараў, калі толькі крызіс на Далёкім Усходзе не патрэбуе неадкладных дзеянняў. Па думцы карэспандэнта, пагадненне аснавана на прынцыпе, па якому амерыканскі флот абараняе Ціхі акіян, а англійскі — ахоўвае Атлантычны акіян, Калі патрэбуюць акалічнасці, пагадненнем прадугледжваецца: 1. Англія прадастаўляе амерыканскаму флоту права ўсебакова скарыстаць Сінгапурскую базу; 2. калі будзе прызнана мэтазгодным, караблі амерыканскага флота наведаюць з місіяй «добрай волі» аўстралійскія і новазеландскія парты; 3. магчымае адкрыццё дарогі Бірма—Кітай павінна пацягнуць за сабой перакідку буйных вайсковых часцей з Аўстраліі ў Бірму і Брытанскую Малайю; 4. ЗША, у выпадку неабходнасці, поўнасцю забароняць вываз усіх ваенных матэрыялаў у Японію.

Ваеннае пагадненне паміж дэ Голем і англійскім камандаваннем

БЕРЛІН, 5 кастрычніка. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае, што французская газета «Се жур» публікуе тэкст пагаднення, заключанага ў пачатку жніўня паміж Чэрчылем і дэ Голем аб умовах ваеннага супрацоўніцтва паміж войскамі дэ Голя і англійскімі ўзброенымі сіламі.

Расшырэнне амерыканскай ваеннай авіяцыі

НЬЮ-ЙОРК, 5 кастрычніка. (ТАСС). Паводле паведамлення агенцтва Юнайтэд Прэс, з 1 ліпеня ваеннае і марское міністэрства ЗША заказалі, прыкладна, 20 тысяч самалётаў і авіяцыйных матораў. У арміі ёсць 3.500 самалётаў, апрача 2 тысяч, заказаных да 1 ліпеня. У ваенна-марскім флоце ёсць звыш 1.800 самалётаў, з якіх 1.234 могуць быць скарыстаны для ваенных аперацый.

ВАЕННЫЯ ПАДРЫХТАВАННІ ТАІ

ТОКІО, 5 кастрычніка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Домей Цусін, урад Таі (Сіяма) 1 кастрычніка афіцыяльна паведаміў, што ён сканцэнтраваў 50 самалётаў на граніцы Інда-Кітая. Улады Французскага Інда-Кітая загадалі эвакуіраваць насельніцтва гарадоў Такек і Саванакет.

ТЭЛЕГРАФНАЯ СУВЯЗЬ ПАМІЖ АКУПІРАВАНЫМІ І НЕАКУПІРАВАНЫМІ ЗОНАМІ ФРАНЦЫІ

НЬЮ-ЙОРК, 5 кастрычніка. (ТАСС). Агенцтва Юнайтэд Прэс перадае, што германскія ўлады дазволілі часткова аднавіць тэлеграфную сувязь паміж акупіраванай і неакупіраванай зонамі Францыі.

НА МЯСЦОВЫЯ ТЭМЫ

АБ РАМОНЦЕ АКОН

Шалун-хлопчык, гуляючы ва дварэ, лоўка кінуў камень і трапіў у акно вашай кватэры. Шкло разляцелася на кавалачкі. Наступіла восень, дуюць халодныя ветры. Трэба неадкладна адрамантаваць акно. Першая-ж думка, якая прыходзіць вам у галаву, — пайсці ў магазін будаўнічых матэрыялаў, купіць шкло патрэбных размераў, а таксама замазку і самому зрабіць рамонт. Але ні ў магазіне на плошчы Свабоды, ні ў магазіне па Комсамольскай вуліцы шкла не знойдзеш. Што-ж рабіць? Вы ўспамінаеце, што ў адным з двароў па Ленінскай вуліцы прытулілася арцель, якая рамантуе вокны. І сапраўды, прыгожая шыльда над варотамі ля гасцініцы «Еўропа» паведамляе ўсім і ўсім, «што шкляны цэх арцелі «Трудзеркало» робіць рамонт акон усякіх размераў і прымае розныя заказы».

Прайшоўшы брудны двор, наведвальнік трапіць у маленькае, цеснае памяшканне цэха. Не паспее ён слова вымавіць, як яго адразу абрываюць:

— Мы шкло не прадаем.

— Добра, тады пашліце рабочага, каб ён адрамантаваў.

— Немагчыма. Усе пайшлі на работу. Ведаеце што, прынясіце сюды раму. К 5 гадзінам прыдуць рабочыя — мы зробім.

Наведвальнік накіроўваецца дадому і праз пару гадзін прыцягвае цяжкую раму.

Уявіце сабе яго абурэнне, калі яму адказваюць:

— Шкла больш няма, прыходзьце праз тыдзень. Можа, будзе. З кавалкаў можам вам змайстраваць.

Такую карцінку вы можаце часта бачыць у шкляным цэху арцелі «Трудзеркало».

Людзі трацяць гадзіны і дні, каб дабіцца дробнага рамонту акна. Ёсць шкло, няма рабочых, прышлі рабочыя, няма шкла. На працягу амаль сарака дзён цэх рабіў рамонт толькі пры ўмове прадастаўлення «давальчаскага сырцу». 2 кастрычніка прыбыла некалькі скрынь шкла, яго хапіла на выкананне некалькіх вялікіх заказаў устаноў. Пэх набраў да 80 заказаў устаноў і прыватных асоб, і калі яны будуць ажыццёўлены, цяжка сказаць.

Загадчык цэха тав. Шылоўскі адкрыта гаворыць, што нарадаў на аконнае шкло не даюць, прыходзіцца даставаць «па блату».

Зусім ясна, што адзінае ў Мінску прадпрыемства па рамонту акон не можа справіцца з задачай абслугоўвання шматлікіх устаноў і жыхароў горада. Наспела пытанне аб расшырэнні сеткі такіх рамонтных пунктаў. Планавыя органы павінны прыняць усе меры для забеспячэння іх шклом. Гэтае, на першы погляд, «дробнае» пытанне датычыць інтарэсаў і патрэб тысяч працоўных. Яно павінна быць вырашана.

С. БУТОМАЎ.

КАРЦІНА «НАРОДНАЕ САБРАННЕ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ»

Маскоўскі мастак тав. Ф. А. Мадораў заканчвае работу над вялікай карцінай «Народнае Сабранне Заходняй Беларусі ў Беластоку» для выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці». Да карціны будзе выстаўлен рад эцюдаў, напісаных мастаком у часе прабывання ў Беластоку.

ХРОНІКА

Соўнарком СССР зацвердзіў калегію Галоўнага Упраўлення Працоўных Рэзерваў у саставе Начальніка Галоўнага Упраўлення т. Маскатава П. Г. (старшыня) і членаў калегіі: тт. Зеленка Г. І. (першы намеснік), Рэмізаў Я. Т. (намеснік), Пракоф'еў В. В. (намеснік), Салтыкоў Т. І., Судзіноўскі А. З. і Маісееў П. А.

(БЕЛТА).

Выдатніца вучобы, студэнтка трэцяга курса Мінскага педагагічнага інстытута комсамолка тав. Н. Г. Дукор атрымлівае кансультацыю па англійскай мове ў выкладчыцы Д. Г. Платнер.

Фото І. Казловіча.

КУРСЫ РАБОТНІКАЎ ПА СОЦЫЯЛЬНАМУ ЗАБЕСПЯЧЭННЮ

У Ждановічах адкрыліся рэспубліканскія месячныя курсы па падрыхтоўцы і павышэнню кваліфікацыі работнікаў органаў соцыяльнага забеспячэння заходніх абласцей БССР. Сярод слухачоў — намеснік загадчыка Беластоцкага аблсобеза, дэпутат Вярхоўнага Совета СССР тав. Дзьячук, загадчык райсобеза ў Шаркоўшчыне, Вілейскай абласці, дэпутат Вярхоўнага Совета БССР тав. Лаўрыновіч, загадчык Высокаўскага райсобеза Брэсцкай абласці, дэпутат Вярхоўнага Совета БССР тав. Бучко і інш. Яны праслухаюць цыкл лекцый аб прынцыпах совецкага соцыяльнага забеспячэння.

ПРЫЗЫЎ У ЧЫРВОНУЮ АРМІЮ І ВАЕННА-МАРСКІ ФЛОТ

У Мінску закончылі сваю работу прызыўныя камісіі Сталінскага і Кагановіцкага раёнаў. Заўтра заканчвае сваю работу камісія Варашылаўскага раёна.

Сталіца БССР паслала ў рады РСЧА фізічна моцных, пісьменных маладых людзей — палкіх патрыётаў сваёй радзімы. Як паведамілі нам у прызыўной камісіі Варашылаўскага раёна, па папярэдніх даных, сярод залічаных у рады РСЧА 30 проц. — стаханаўцы вытворчасці, 75 проц. прызыўнікоў з'яўляюцца значкістамі ПВХА, 80 проц. — ГСА, 60 проц.— варашылаўскія стралкі. 65 проц. прызыўнікоў — члены комсамола.

Такія-ж выдатныя вынікі і па Сталінскаму і Кагановіцкаму раёнах сталіцы БССР.

***

У памяшканні Мінскага пасажырскага вакзала адкрыт агітпункт. Ён размешчан у прасторнай светлай зале. Сцены ўпрыгожаны партрэтамі Леніна і Сталіна, Наркома абароны Саюза ССР маршала Совецкага Саюза тав. Тімашэнка, плакатамі, лозунгамі і чырвонымі сцягамі.

З самай раніцы на агітпункце поўна народу. Тут можна сустрэць дэмабілізаваных чырвонаармейцаў і маладых байцоў, якія толькі адпраўляюцца ў часці.

Чыста і ўтульна ў зале. На сталах — журналы і газеты. Ёсць даміно, шахматы, шашкі, музыкальныя інструменты, настольны більярд. З дэмабілізаванымі і прызыўнікамі праводзяцца гутаркі аб ваеннай прысязе, аб бягучай палітыцы і т. д.

Будаўніцтва завода туалетнага мыла

ГОМЕЛЬ. (Кар. «Звязды»). Наркамхарчпром СССР зацвердзіў праект пабудовы на Гомельскім тлушчакамбінаце завода туалетнага мыла. Кошт пабудовы—2 млн. рублёў. Магутнасць завода — 3 тыс. тон туалетнага мыла ў год.

Будаўніцтва разгорнецца ў пачатку 1941 г. Заказы на асноўнае абсталяванне ўжо размешчаны на металургічных заводах Кіеўскай абласці. Завод уступіць у эксплаатацыю ў 1942 г.

Рэканструкцыя радыёвузла ў Чырвонай Слабадзе

У раённым цэнтры — Чырвоная Слабада, Мінскай абласці, пушчан у эксплаатацыю нанова рэканструіраваны радыёвузел. Радыёвузел забяспечан новай апаратурай.

Куды сёння пайсці?

Сёння — 6 кастрычніка ў Мінску будзе праведзен рад цікавых фізкультурных і культурных мерапрыемстваў:

3 раніцы на кортах Усебеларускага стадыёна па Пушкінскай вуліцы — прадаўжэнне розыгрыша пяршынства па тэнісу.

★ **Днём на стадыёне «Дынама» імені Кірава** адбудзецца матч на Кубак СССР па футболу. На зялёным полі сустрэнуцца каманды спартыўнага таварыства «Дынама» Мінска і Сталінабала.

★ **У 18 гадзін** у вялікай зале Дома партыйнай асветы дацэнт Ленінградскага педагагічнага інстытута тав. Ефімаў прачытае для працоўных горада лекцыю аб міжнародным становішчы. Пасля лекцыі адбудзецца канцэрт.

★ **У 20 гадзін** у басейне Мінскага акруговага Дома Чырвонай Арміі імені К. Е. Варашылава будуць праведзены паказальныя спаборніцтвы па плаванню. У іх прымуць удзел лепшыя плаўцы Дома Чырвонай Арміі, ордэнаноснага інстытута фізкультуры і спартыўных таварыстваў. Сярод удзельнікаў—рэкардсмены СССР Г. Сімёнаў, К. Крукаў і інш. У заключэнне будзе праведзен матч па водным поло.

★ **У 21 гадзіну** ў памяшканні Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі арганізуецца канцэрт з удзелам дацэнта кансерваторыі Азацяна.

★ **У 21 гадзіну** ў клубе імені Сталіна адбудзецца канцэрт артыстаў Белдзяржэстрады.

★ У Дзяржаўным ордэна Леніна тэатры оперы і балета БССР сёння ідзе опера «Русалка»; у Дзяржаўным ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драматычным тэатры — «Партызаны»; у Дзяржаўным яўрэйскім тэатры БССР — «Цвей кунілемлэх».

ШАХМАТЫ

ЧЭМПІЯНАТ СССР ЗАКОНЧЫЎСЯ

Свята совецкіх шахматыстаў — XII шахматны чэмпіянат закончыўся.

Пераможцамі турніра аказаліся: прадстаўнікі плеяды маладых і па ўзросту, і па майстэрскаму стажу майстраў — Ігар Бандарэўскі. Вопытны турнірны баец Андрэй Лілієнта, былы чэмпіён Венгрыі, якому совецкае пасанства дало недаставаўшую магчымасць удасканалення, упэўненасць і волю да перамогі.

Але сапраўдны, хоць і неафіцыяльны лідэр раможца гэтага выдатнейшага турніра, — гонар совецкае шахматнае мастацтва.

Рупіна і «нічыйная смерць» шахмат, панучая за межамі Совецкага Саюза, — не прыхільнікаў сярод совецкіх шахматыстаў-прадаўжальнікаў Чыгорына, падняўшых шахматнае мастацтва на небывалую вышыню.

Як іграюць нашы «маладзейшыя» з майстраў сведчыць хоць-бы наступны, зусім адзіны прыклад: ініцыятыўная, поўная і пружанасці барацьба пасля ходу белых 20. Се3—g1 (зусім не для размену!) прывяла да наступнай пазіцыі:

Чорныя: Котаў



a b c d e f g h

Белыя: Балеслаўскі.

Паследвала: 20... Ке8 — f6 (пасля 20... С : g5 21. Ф : g5 Kf6 22. Ке4! атака белых была-б вельмі небяспечная. Цяпер па першаму ўражанню здаецца навіна, што ў чорных лепш — у белых нехапае пешкі, пагражае страта другой, небяспечнай на каралеўскім флангу не відаць... Але:) 21. Kd4 — f5!! (бліскучая, нечакана выгрываючая камбінацыя, цалкам у «стылі» маладых майстраў СССР) 21... е6 : f5 (нічога лепшага няма) 22. Кс3 — d5! Kf6 : d5 (вынужана) 23. Cf3 : d5 + Kpg8 — h8 (адступленне караля на f8 прыводзіць да пройгрышу пасля С : е7 + і Ф : g7 + 24. Cg5 : е7 Лd8 — е8 (здаецца, чорныя маюць перадышку, калі не выратаванне але...) 25. Се7 : d6!! (цэлы феерверк задачных камбінацый!) 25... Фс7 : d6 26. Cd5—Фd6—е7 27. Cf7 : е8 Фе7 : е8 28. Лd1—f5—f4 29. Лf1 : f4 Лb4 : b2 (толькі цяпер ужо позна, чорныя змаглі ажыццявіць нагрозу дваццатага ходу). 30. Лf4 — Лb2 : с2 31. Ле4 : е5 Фе8—g6 32. Ле5—е Cd7—е6 33. Ле7 : е6—Здаўся.

Такія прыгожыя камбінацыі зусім не часта сустракаюцца нават і ў партыях вельмайстраў!

У РЭСПУБЛІКАНСКАЙ ШАХМАТНАЙ СЕКЦЫІ

Шахматны і шашачны чэмпіянаты рэспублікі будуць праведзены ў г. Мінску з 12 лістапада да 1 снежня. Зацверджан склад удзельнікаў чэмпіяната: майстар Вераса, майстар Сіліч, Брэйтман (Гомель). Сташэўскі (Магілеў), Шпігельмахер (Брэст), Крэмер (Піншская абласць), Левітас (Чырвоная Армія), Заблудоўскі, Барын і Кауфман (Беласток), Зісман, Серабрыйскі і Майзель (Віцебск), трох пераможцы праходзячага зараз чэмпіяната горада Мінска. Усяго 16 чалавек, з іх — першакатэгорнікаў і 2 майстры

У саставе удзельнікаў шашачнага чэмпіяната: майстар Гардон, Радашынскі (Гомель), Ройхварг (Чырвоная Армія), Грушэцкі, Патапенка і Кабакоў (Віцебск), Сасонкін і Мелікаў (Магілеў), і 4 пераможцы праходзячага чэмпіяната горада Мінска. Усяго 12 удзельнікаў, з іх — 1 майстар, 11 першакатэгорнікаў.

Паведамленне

7 кастрычніка, у 8 гадзін вечара, у Доме партыйнай асветы Мінгаркома КП(б)Б (малая зала) адбудзецца чарговы заняткі семінара сакратароў партарганізацый і дырэктараў прадпрыемстваў г. Мінска, работнікаў гаркома і райкома КП(б)Б.

На семінары будзе прачытана лекцыя на тэму «Спежаньскае ўзброенае паўстанне ў 1905 годзе». Лектар гаркома КП(б)Б тав. Саевіч.

ДОМ ПАРТЫЙНАЙ АСВЕТЫ МІНГАРКОМА КП(б)Б.

Адказны рэдактар Т. С. ГАРБУНОЎ.

ДЗЯРЖАЎНЫ ОРДЭНА ЛЕНІНА ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА БССР

6 кастрычніка

РУСАЛКА

8/X—Чыо-Чыо-Сан

Пачатак у 8 г. 30 м. веч.

Каса на атрыманне білетаў са скідкай 20 проц. па ільготнаму талону і продажу ільготных талонаў знаходзіцца ў б. Доме саюзаў — адкрыта з 12 г. дня да 8 г. веч.

ДЗЯРЖАЎНЫ ОРДЭНА ЛЕНІНА ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА БССР

10 і 12 кастрычніка ПРЭМ'ЕРА

ЛЕБЯДЗІНАЕ ВОЗЕРА

Балет у 4 дзеях, муз. ЧАЙКОЎСКАГА.

Кінатэатр «Чырвоная зорка» ТРЫНАЦЦАЦЬ

Кінатэатр «Родина» ДУРСУН

Кінатэатр «Інтэрнацыянал» СТО МУЖЧЫН І АДНА ДЗЯЎЧЫНА

Кінатэатр «Спартак» ПРЫЯЦЕЛІ

Кінатэатр «Навіны дня» 1. Саюзкіножурналы №№ 85 і 86. 2. Журналы «Совецкая Беларусь» №№ 51 і 52.

Першы Беларускі дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драматычны тэатр.

6 кастрычніка ПАРТЫЗАНЫ

8 кастрычніка ХТО СМЯЕЦЦА АПОШНІМ

Пачатак спектакля ў 8 г. вечара.

Білеты ў касе тэатра з 2 г. дня да 9 г. вечара.

Па калектыўных заяўках прадастаўляецца скідка.

Дзяржаўны яўрэйскі тэатр БССР

6 і 7 кастрычніка ЦВЕЙ КУНІЛЕМЛЭХ

Пачатак у 8 г. 30 м. вечара.

Каса на атрыманне білетаў са скідкай 20 проц. па ільготнаму талону і продажу ільготных талонаў знаходзіцца ў б. Доме саюзаў — адкрыта з 12 г. дня да 8 г. веч

Цяперашні кінатэатр РУСЛАН І ЛЮДМІЛА

У выкананне пастановы ЦК ВКП(б) і Совета Народных Камісараў Саюза ССР «Змяненні ў пілітыцы загатовак і закупак сельскагаспадарчых прадуктаў»

АРГАНІЗАВАНА

БЕЛАРУСКАЕ РЭСПУБЛІКАНСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ

„ЗАГОТЖИВСЫРЬЕ"

Раённыя загатоўчыя канторы «ЗАГОТЖИВСЫРЬЕ»,

ПРАВОДЗЯЦЬ ЗАГАТОЎКУ

ШЭРСЦІ, СКУРАНОЙ СЫРАВІНЫ, КОНВОЛАСУ, ПУШНІНЫ І ФУТРАВАЙ СЫРАВІНЫ ва ўсіх раёнах рэспублікі.

ЗАГАТОЎКА ПРАВОДЗІЦЦА НА СКЛАДАХ РАЙЗАГОТКАНТОР, РАЗ'ЯЗНЫМІ АГЕНТАМІ І ЗАБОЙШЧЫКАМІ ЖЫВЁЛЫ.

Не затрымлівайце ў гаспадарках шэрсць, конволас, пушнафутравую і скураную сыравіну,—

ПРАДАВАЙЦЕ «ЗАГОТЖИВСЫРЬЕ»

ЗДАТЧЫКАМ ШЭРСЦІ ПА ДЗЯРЖЗАКУПЦЫ ПРАДАЮЦЦА БАВАЎНЯНАПАПЯРОВЫЯ ТКАНІ ПА НАСТУПНЫХ НОРМАХ: за мерыносавую шэрсць — 80 проц., поўгрубую і грубую—40 проц. ад кошту праданай па дзяржзакупцы шэрсці.

БЕЛАДДЗЯЛЕННЕ «ЗАГОТЖИВСЫРЬЕ».

Праўленне саюза совецкіх мастакоў БССР

(Мінск, Комуністычная, 39)

па ўпаўнаважанню Упраўлення па ахове аўтарскіх праў пры Оргкамітэце саюза совецкіх мастакоў СССР у адпаведнасці з пастановай СНК СССР № 186 ад 4/II 1940 года і інструкцыяй НКФ СССР ад 12/VII 1940 г.

ПРАПАНУЕ ўсім дзяржаўным, профсаюзным і грамадскім арганізацыям, установам і прадпрыемствам,

ЯКІЯ УПЛАЧВАЮЦЬ УЗНАГАРОДУ МАСТАКАМ усіх спецыяльнасцей, жывапісцам, афарміцелям, скульптарам, графікам, мастакам прамысловасці, тэатральным і кінамастакам ЗА ВЫКАНАНЫЯ ІМІ МАСТАЦКІЯ РАБОТЫ

ЗРАБІЦЬ НАЛІЧЭННІ Ў РАЗМЕРЫ 3 ПРОЦ.

з выплачанай сумы ўзнагароды ў МАСТАЦКІ ФОНД СССР на яго разліковы рахунак № 550410 у 2-м аддзеле аперацыйнага ўпраўлення Праўлення дзяржаўнага банка ў Маскве.

НАЛІЧЭННЕ 3 ПРОЦ. РАБІЦЬ З УСІХ СУМ, ПАЧЫНАЮЧЫ З 1 СТУДЗЕНЯ 1940 ГОДА.

Адначасова з пералічэннем узносаў усе плацельшчыкі ўзносаў АБАВЯЗАНЫ ПРАДСТАЎЛЯЦЬ Упраўленню па ахове аўтарскіх праў Оргкамітэта саюза совецкіх мастакоў СССР у Маскве ВЕСТКІ:

а) аб суме выплачанай узнагароды мастакам за мінулы месяц;

б) аб суме праведзеных узносаў у Дзяржбанк;

в) нумар і дату плацёжнага даручэння Дзяржбанку.

Копію вестак прадстаўляць саюзу совецкіх мастакоў БССР (Мінск, Комуністычная, 39).

ПРАЎЛЕННЕ САЮЗА СОВЕЦКІХ МАСТАКОЎ БССР.

БЕЛАРУСКІ

ПОЛІТЭХНІЧНЫ ІНСТЫТУТ

аб'яўляе прыём у аспірантуру

(з адрывам ад вытворчасці)

па наступных спецыяльнасцях:

ГЭХНАЛОГІЯ МАШЫНАБУДАЎНІЦТВА,

МЕТАЛАРЭЖУЧЫЯ СТАНКІ,

ГЭХНАЛОГІЯ ПРАМЫСЛОВАГА ТОРФАЗДАБЫВАННЯ,

МАШЫНЫ ДЛЯ ЗДАБЫЧЫ І ТРАНСПАРТА ТОРФУ,

ГІДРАТЭХНІЧНЫЯ ПАБУДОВЫ,

ГІДРАТЭХНІЧНАЯ МЕЛІЯРАЦЫЯ.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ ДА 10 КАСТРЫЧНІКА 1940 ГОДА.

Пры заяве прадстаўляюцца: дыплом аб сканчэнні ВТНУ, аўтабіяграфія, дакумент аб адносінах да воінскага абавязку, характарыстыка з апошняга месца работы.

ПРЫЁМНЫЯ ІСПЫТЫ З 10 КАСТРЫЧНІКА ў аб'ёме праграм інстытута па курсах: асновы марксізма-ленінізма, замежная мова, спецыяльная дысцыпліна.

Заявы пасылаць па адрасу: Мінск, вул. Пушкіна, 49. Вучэбна-навуковае ўпраўленне Беларускага політэхнічнага інстытута.

ПРАГРАМЫ РАДЫЁПЕРАДАЧ

(ст. РВ—10)

ЧАЦВЕР, 10 КАСТРЫЧНІКА

10.00—Перадача для малодшых школьнікаў. Жыткоў — «Мяцель». 17.06—Перадача для дзяцей. Канцэрт-загадка. 18.00—Літмузперадача А. С. Пушкін — «Бахчысарайскі фантан». 19.30—Камерны канцэрт з твораў Моцарта. 20.15—Лекцыя ў дапамогу вывучаючым марксізм-ленінізм. Аб кнізе Ф. Энгельса — «Дыялектыка прыроды». 21.06—Драматычная легенда Берліоза — «Гібель Фауста».

ПЯТНІЦА, 11 КАСТРЫЧНІКА

13.15—Канцэрт з твораў беларускіх кампазітараў. Столаў — сімфанічная паэма — «Вызваленне», Шчаглоў — 10 песень Заходняй Беларусі, Цікоцкі — арэтарыя — «Верасень месяц». Выканаўцы: сімфанічны аркестр, хор радыёкамітэта, народная артыстка БССР — ордэнаносец Млодзік, заслужаны артыст рэспублікі—орд. Дзянісаў, артысты: Валчанецкая, Вастокаў, Некрасаў, Зайдліц, Полонская, Грахольскі. 17.06—Перадача для піонераў і старшых школьнікаў. Казкі народаў Прыбалтыкі. 17.30—Літмузперадача. Я. Купала — «Курган». Чытае засл. арт. БССР — ордэнаносец Платонаў. 18.15—Развучванне песні. 19.30—Артыкул акадэміка Грыгор'ева — «Новейшыя дасягненні совецкай геаграфіі». 19.45—Радыёфільм — «Новымі вытворчымі перамогамі сустрэнем вялікае свята — гадавіну Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі». 19.58—Опера Вердзі «Отэло».

СУБОТА, 12 КАСТРЫЧНІКА.

17.06—Перадача для дзяцей «Жыцці школы». 17.15—Перадача для малодшых школьнікаў. Прышвін — апавяданні «Гаечкі» і «Журка». 18.15—Сімфанічны канцэрт з твораў Бетховена. 19.30—Камерны канцэрт з твораў Рахманінава. 20.15—Лекцыя ў дапамогу вывучаючым марксізм-ленінізм. «Кастрычніцкая рэволюцыя і тактыка большавікоў». 21.05—Літмузперадача на яўрэйскай мове Мендэле Мойхер Сфорым «Фішка кульгавы». 21.45—Папулярны канцэрт з твораў рускіх і заходне-еўрапейскіх кампазітараў.

БЕЛАРУСКАЙ БАЗЕ «ОПТМЕТЫЗ»

патрабуюцца

ТАВАРАВЕДЫ

для апаратыўнай работы базы.

Звяртацца па адрасу: Мінск, Доўгабродская, 92.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Мінск, Совецкая, 49. Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара — 20-000 (камутатар), дадатковы — 102, прыёмная рэдактара — 2-15-52, намесніка адказнага рэдактара — 2-51-88, адказнага сакратара — 2-13-53, намесніка адказнага сакратара — 2-24-12, сакратарыята — 2-39-55. АДДЗЕЛАЎ: заг. партыйнага аддзела — 2-18-46, літработнікаў — 2-13-56, заг. аддзела прапаганды і агітацыі — 2-51-89, заг. эканамічнага аддзела — 2-08-30, літработнікаў — 2-15-56, літработнікаў па літаратуры і мастацтву, школах і ваенна-фізкультурнай рабоце — 2-18-85, унутранай інфармацыі — 2-13-99, аддзела рабселькораў і пісем працоўных — 2-08-44, 2-18-45, заг. выдавецтва—2-13-58, бухгалтарыі выдавецтва і аддзела аб'яў — 2-13-60, выпускаючага — 2-47-68, карэктарскай — 2-13-57.

У3643 Мінск, друкарня «Звязды», Совецкая 49. М., М., Ш.